ПРАЛЕТАРЫ УСЯГО СВЕТУ, АБЪЕДНАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 168 (3276) Пятніца, 26-га ліпеня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII

Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—819, канторы—731

АПОШНІЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

ПАРЫЖ, 24. У нядзелю, 21-га ліпеня, рабочае насельніцтва парыскага прыгарада Вільжуіў наладзіла ўрачыстую сустрэчу нядаўна вызваленаму з турмы рэдактару «Юманітэ»—т. Ваіян Кутур'е, абранаму ў маі мэрам Вільжуіва

Арганізавана вялікая камуна—імя Варашылава

ЗА 50 ВЁРСТ АД БЕЛАПОЛЬСКАЙ МЯЖЫ, У ГАРАДОЦКІМ РАЁНЕ, ВІЦЕБСКАЙ АКРУГІ, АРГАНІЗАВАНА СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЯ КАМУНА-ГІГАНТ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА. КАМУНА АРГАНІЗАВАНА НА ПЛОШЧЫ 1.500 ГЭКТАРАЎ ЗЯМЛІ. ЧЛЕНЫ КАМУНЫ—ДЭМАБІЛІЗАВАНЫЯ ЧЫРВОНААРМЕЙЦЫ І БЫЛЫЯ ПАРТЫЗАНЫ.

У нядзелю, 28 ліпеня г.г., а 5-й гадз. дня ў гарадзкім садзе „ПРАФІНТЭРН“

АДБУДЗЕЦЦА АДКРЫТЫ СХОД

кастрычнікавай раённай партыйнай арганізацыі

—СУМЕСНА—

з беспартыйнымі рабочымі раёну

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Даклад аб міжнародным і ўнутраным становішчы (дакл. сакратар ЦК КП(б)Б т. ВАСІЛЕВІЧ).

Члены і кандыдаты партыі ўваходзяць па партбілетах, беспартыйныя рабочыя — па спэцыяльных білетах, якія разасланы па ячэйках.

Кастрычнікавы РК КП(б)Б.

ПЕРАД МІЖНАРОДНЫМ ЧЫРВОНЫМ ДНЕМ

французскі ўрад шпаркімі крокамі ідзе да абвяшчэньня кампартыі па-за законам

Рэпрэсіі супроць рэвалюцыйных рабочых узмацняюцца

Нарада міністраў

ПАРЫЖ, 24. Адбылася нарада, у якой прымалі ўдзел міністр юстыцыі Барту, міністр унутраных спраў Тард'е, прэфэкт парыскай паліцыі П'ят, пракурор судовай палаты, а таксама вышэйшыя чыноўнікі паліцыі і міністэрства юстыцыі. Нарада пастанавіла прыцягваць усіх, што ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы дня 1-га жніўня да судовай адказнасьці па абвінавачаньні ў «змове супроць безапаснасьці дзяржавы». Гэтае абвінавачаньне будзе грунтавацца на законе, выданым яшчэ пры імпэратары Напалеоне 1-м.

Згодна пастанове нарады 96 арыштаваных на партыйным камуністычным сходзе, а таксама каля 100 іншых арыштаваных аддаюцца пад суд на падставе названага закону. Судовыя ўлады выдалі паліцыі ордэр на арышт усіх «заклікаючых да маніфэстацыі 1-га жніўня», а таксама на вобыскі ў памяшканьнях усіх рабочых арганізацый. Орган кампартыі «Юманітэ» заклікае рабочых да барацьбы з урадавымі рэпрэсіямі і заяўляе:

«Урад хуткімі крокамі набліжаецца да абвяшчэньня па-за законам кампартыі і ўнітарных прафсаюзаў. Безадкладна падымайцеся на абарону кампартый, унітарнай канфэдэрацыі працы, «Юманітэ» і ўсіх нашых рэвалюцыйных арганізацый. На наступленьне ўраду адказвайце адзінадушнай мабілізацыяй пралетарыяту». (ТАСС).

Загад аб арышце членаў ЦК французкай кампартыі

ПАРЫЖ, 24. Па вестнах вячэрніх газэт, урад аддаў загад аб арышце ўсіх членаў ЦК французкае камуністычнае партыі па абвінавачаньні ў «актыўным удзеле ў арганізацыі рэвалюцыйнага дня 1-га жніўня». Паліцыя атрымала ўжо ордэры на арышт членаў ЦК Барб'е, сакратара палітбюро Фэра і камуністычных дэпутатаў Дзюкло і Карнавэна.

Сёньня былі зроблены вобыскі ў кватэрах сакратара камсамолу Галопэна, сакратароў унітарных прафсаюзаў Ракамона і Селора, якіх паліцыя не застала аднак у хаце. Рэакцыйна-нацыянальная «Лібэртэ» піша, што ў большасьці выпадкаў паліцыі ня ўдаецца затрымаць падлягаючых арышту асоб. Яны загадзя хаваюцца, але арышты будуць ажыцьцёўлены ў бліжэйшы час».

Бязупынныя вобыскі і арышты ў Парыжы

ПАРЫЖ, 24. Паліцыя зрабіла вобыск ў памяшканьні унітарных прафсаюзаў, дзе па словах «Юманітэ», яна перарыла ўвесь архіў, пісьмовыя сталы, забіраючы ўсе паперы. Захопленыя дакументы перавезены на двух грузавіках у камэру судзьдзі сьледчага. Ноччу быў зроблен вобыск ў памяшканьні камсамолу. Ноччу-жа былі арыштаваны сакратары трох унітарных прафсаюзаў. Арыштаваны таксама сакратар парыскай раённай арганізацыі кампартыі Мэзьер. 24-га былі зроблены вобыскі ў генэральнага сакратара ўнітарнай канфэдэрацыі працы Джобільле, які быў арыштаваны. (ТАСС).

***

ПАРЫЖ, 24. Гавас паведамляе: «Паліцыя зрабіла вобыск у аднэй друкарні, дзе канфіскавала брашуры на пэльскай, расійскай і яўрэйскай мовах, якія заклікаюць вайскова-служалых да непаслушэньства. Паліцыя зрабіла таксама вобыск у рабоча-сялянскім банку». (ТАСС).

Варшаўскія камунары рыхтуюцца

ВАРШАВА. Камуністычная партыя Польшчы ня гледзячы на шалёны тэрор з боку фашысцкага ўраду энэргічна рыхтуецца да міжнароднага чырвонага дня. Так «Жэч Паспаліта» у № 198 піша, што камуністыя арганізоўваюць у Варшаве масавыя мітынгі, сходы, а камуністычныя «тэхнікі» вывешваюць плякаты з рэвалюцыйнымі лёзунгамі, прысьвечанымі гэтаму дню.

Газэта далей падае, што на вул. Пронзынскага на тэлеграфным дроце быў зьняты паліцыяй плякат, на якім былі вышыты лёзунгі: «Прэч ваенныя падрыхтаваньні супроць СССР», «Прэч фашызм», «Вызваліць вязьняў палітычных».

На вуліцы Гусінай паліцыяй з тэлеграфнага дроту быў зьняты другі камуністычны плякат з лёзунгамі: «Няхай жыве міжнародны Чырвоны дзень—1-га жніўня».

У Вільні-жа, як піша «Дэ. Віленскі» мясцовыя «вывратоўцы» пачалі як у горадзе, так і па вёсках энэргічную камуністычную агітацыю. Недалёка ад Смаргоні і Сьвянцян на дарогах раскідана шмат камуністычных праклямацый. Акрамя таго ноччу з 19 на 20 ліпеня ў Сьвянцянскім павеце было шмат раскідана камуністычных адозваў, якія заклікаюць батракоў і сельгасрабочых да забастоўкі і барацьбы з польскім фашызмам.

КАНФІСКАЦЫЯ ПРАКЛЯМАЦЫЙ РАБОЧАЙ ПАРТЫІ Ў БАЎГАРЫІ

ВЕНА, 22. Як падаюць з Софіі, паліцыя канфіскавала праклямацыі рабочай партыі, якія заклікаюць рабочых да генэральнай забастоўкі і вулічных дэманстрацый у дзень 1-га жніўня. (ТАСС).

Энэргічная падрыхтоўка кітайскай кампартыі

ШАНХАЙ, 24. Ангельскі рэакцыйны орган «Норд Чайна Дэйлі Ньюс», спасылаючыся на даныя паліцыі, паведамляе, што кітайская кампартыя вядзе энэргічную падрыхтоўку да правядзеньня міжнароднага дня 1-га жніўня. Кітайскай кампартыяй арганізуюцца масавыя дэманстрацыі ў радзе гарадоў, у тым ліку Шанхаі, Харбіне, Мукдэне, Пэйпіне, Ханькоу, Кантоне, Нанкіне. Дэманстрацыі будуць праведзены пад агульным лёзунгам барацьбы з імпэрыялізмам, пратэсту супроць новай вайны і за абарону Кітайскай рэвалюцыі і Савецкага Саюзу. Падрыхтоўваючы сьвяткаваньне міжнароднага чырвонага дня ў Шанхаі, кітайская кампартыя і камсамол вядуць шырокую агітацыю сярод рабочых, студэнтаў, сялян і вайсковых часьцей, а таксама сярод чужаземных салдат. Сярод падрыхтаваных плякатаў ёсьць плякаты з надпісамі: «Прэч Гаміндан, які забіў тысячы кітайскіх рабочых і сялян», «прэч ангельскі рабочы ўрад, што працягвае інтэрвенцыю ў Кітаі», «прэч Гаміндан, што ўмаўляецца з імпэрыялістымі аб наступленьні на СССР», «прэч контр-рэвалюцыйную кліку, што захапіла КУЧ па загаду імпэрыялістых». (ТАСС).

ЗАКЛІК ДА РАШУЧАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА АБАРОНУ СССР

МОНТЭВІДЭО, 24. Рэвалюцыйнае аб'яднаньне прафсаюзаў Лацінска-амэрыканскіх краін зьвярнулася да працоўных мас Паўночнай і Паўднёвай Амэрыкі з адозвай, у якой заклікае іх да правядзеньня дэманстрацый пратэсту супроць правакацыі імпэрыялістычнай вайны з кітайскімі мілітарыстымі. Прафсаюзнае аб'яднаньне заклікае працоўныя масы абедзьвюх Амэрык пачаць рашучую барацьбу за абарону бацькаўшчыны—СССР. (ТАСС).

ВОБЫСК У ПАМЯШКАНЬНІ САКРАТАРЫЯТУ ЦК ЧЭХА-СЛАВАЦКАЙ КАМПАРТЫІ

ПРАГА, 24. Паліцыя ацапіла памяшканьне сакратарыяту ЦК Чэха-Славацкай кампартыі, зрабіла ў памяшканьні вобыск, які цягнуўся каля 2-х гадзін. У час вобыску паліцыя ўзламала запертыя сталы і шафы. Уся знойдзеная ў памяшканьні перапіска і друкаваныя матар'ялы былі захоплены паліцыяй. Захоплены паліцыяй пры вобыску матар'ял аказаўся настолькі вялізным, што для перавозкі трэба было выклікаць грузавік. (ТАСС).

ДРУГІ АНТЫІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНЫ КАНГРЭС

Адзіны фронт буржуазіі, ангельскай рабочай партыі і міжнароднай с.-д. супроць СССР

Выступленьне кітайскага прадстаўніка Чу І-то

ФРАНКФУРТ НА МАЙНЕ, 24. На пасяджэньні кангрэсу лігі барацьбы з імпэрыялізмам і калініяльным прыгнечаньнем выступіў з дакладам кітайскі прадстаўнік Чу І-то. Чу І-то зазначыў на надзвычайную складанасьць і цяжкасьць барацьбы рабочых і сялян Кітая супроць імпэрыялістых, кітайскіх капіталістых і мілітарыстых, а таксама супроць Гаміндану. **Прыход аграрнай рэвалюцыі ў Кітаі няўхільны і яна будзе пачаткам сапраўднай рэвалюцыі. Нанкінскі ўрад існуе і кіруе толькі таму, што за яго сьпіной стаяць ПАЗШ.**

Прыводзячы шматлікія даныя, якія характарызуюць эканамічнае і палітычнае становішча працоўных мас Кітая і напамінаючы аб жахлівых выніках белага тэрору, які праводзіць нанкінскі ўрад, Чу І-то заклікае індыйскіх рэвалюцыянэраў не забываць урокаў кітайскай рэвалюцыі. **Нанкінскі ўрад пануе, сказаў Чу І-то таму, што мы яшчэ слабы.** Аднак, набліжаецца тэй час, калі ўвесь Кітай пасьледуе прыкладу кантонскага пралетарыяту, які стварыў саветы.

Выкліканы імпэрыялістычнымі дзяржавамі савецка-кітайскі канфлікт і пагроза вайны накіраваны ня толькі супроць СССР, але і супроць працоўных мас Кітая. Пры гэтым выразна выявіліся два фронты: на **адным баку Нанкінскі ўрад, ангельская рабочая партыя і міжнародная сацыял-дэмакратыя; на другім фронце—кітайскія працоўныя масы, СССР, міжнародная рэвалюцыйная рабочая кляса, Камінтэрн і кітайская камуністычная партыя.**

У распачатых спрэчках першай выступіла кітайская дэлегатка Лі-Фаэ, якая ахарактарызавала становішча жанчын ў Кітаі і ролю рэвалюцыйнага руху жанчын ў кітайскай рэвалюцыі. Усе прамоўцы падкрэсьлівалі сваю салідарнасьць з барацьбой кітайскіх рэвалюцыйных мас і пацьвердзілі, што справа рэвалюцыйных працоўных мас Кітая—справа рэвалюцыйнае рабочае клясы ўсяго сьвету і адзначалі неабходнасьць вывучэньня ўрокаў цяперашняга перыяду кітайскай рэвалюцыі.

Па прапанове 13 дэлегатаў Лацінска-амэрыканскіх краін, Кітая і Індыі, кангрэс пастанавіў паслаць адказ на прывітальную тэлеграму Крэстінтэрну. Кангрэс ў сваёй тэлеграме запэўняе Крэстінтэрн ў сваёй рашучасьці разам з анты-імпэрыялістычнай барацьбой весьці энэргічную сыстэматычную работу і ў галіне арганізацыі сялянскіх мас ў барацьбе за зямлю. (ТАСС).

Адстаўка ангельскага вярхоўнага камісара ў Эгіпце

ЛЁНДАН, 24. Адказваючы на запытаньне ў палаце вобшчын, міністар замежных спраў Гендэрсон паведаміў, што ангельскі вярхоўны камісар у Эгіпце Лёрд Лёйд па прапанове ўраду падаў у адстаўку. У палітычных колах адстаўка Лёйда па прапанове ўраду выклікала вялікую сэнсацыю. Прагрэсыўныя элемэнты ня ўтойваюць свайго задаваленьня адстаўкаю Лёйда, бо ён лічыўся аднэй з самых «зловещих» чігур брытанскага імпэрыялізму і правадыром бліжня-ўсходняй палітыкі Англіі. У добра паінфармаваных колах, аднак, ня лічаць, каб адстаўка зьмены ангельскай маючай адбыцца зьмены ангельскай палітыкі ў Эгіпце. У прыватнасьці, лічыцца непраўдападобным, каб урад Макдональда мог адмовіцца ад перагавораў з эгіпецкім прэм'ерам Махмуд Пашай, супроць якога катэгарычна пратэстуе партыя эгіпецкіх нацыяналістых Вафд. (ТАСС).

ПА СЬЛЯДОХ ЦЬВЁРДАЛОБЫХ

ЛЁНДАН, 24. Міністар працы Маргарыта Бонфільд адмовілася прыняць дэлегацыю беспрацоўных з тае прычыны, што гэта «не дало-б ніякіх карысных вынікаў». Ня гледзячы на гэтую адмову дэлегацыя беспрацоўных—13 членаў зьявілася ў міністэрства працы і патрабавала, каб Маргарыта Бонфільд прыняла яе. Чыноўнікі міністэрства заявілі, што Маргарыта Бонфільд не намерана прыняць дэлегацыю; удзельнікі дэлегацыі сказалі, што яны не пакінуць памяшканьне міністэрства, пакуль не даб'юцца прыёму ў міністра працы. Тады чыноўнікі выклікалі паліцыю, якая сілай выгнала дэлегацыю. (ТАСС)

Новы ўклад у індустрыялізацыю

Гаспадарчае значэньне нашага бюджэту (у аднаку ад бюджэтаў капіталістычных дзяржаў, дзе яны маюць пераважна адміністрацыйнае і ваеннае значэньне) робіць яго адным з важнейшых прылад гаспадарчае палітыкі савецкае дзяржавы, накапленьня і перазьмеркаваньня народнага даходу. Натуральна таму, што ў бюджэце знаходзяць адлюстраваньне ўсе гаспадарчыя задачы нашае сапраўднасьці, у прыватнасьці задача скарыстаньня ў інтарэсах сацыялістычнага будаўніцтва дробных зьберажэньняў насельніцтва. Гэту задачу на працягу апошніх год нам удавалася вырашыць з усё большым посьпехам. Зараз капітальнае будаўніцтва прамысловасьці фінансуецца напалову за кошт сродкаў, што зьбіраюцца праз дзяржпазыкі. У бягучым годзе роля дзяржкрэдыту ўзьнялася дзякуючы посьпеху другой пазыкі індустрыялізацыі. Але ў рэалізацыі другой пазыкі індустрыялізацыі было і слабое месца—работа па распаўсюджаньні яе ў вёсцы. Сярод сялянскага насельніцтва гэта пазыка была разьмешчана ўсяго ў разьмеры 40 мільёнаў рублёў, што зусім не адпавядае ўзросшым грашовым накапленьням вёскі. Важнейшымі прычынамі невыстарчальнага разьмеркаваньня зьяўляецца слабасьць работы па распаўсюджаньні пазык у вёсцы і слабая мабілізацыя ўвагі мясцовых органаў да справы дзяржкрэдыту.

Выпраўленьне гэтага недахопу павінна зьявіцца цэнтральным момантам пры правядзеньні кампаніі па рэалізацыі выпускаемае, згодна апублікаванаму сёньня дэкрэту, 3-й пазыкі індустрыялізацыі. Выпуску гэтае пазыкі папераджаюць шматлікія рэзалюцыі фабрычна-заводзкіх рабочых і служачых аб пажаданьні і своячасовасьці новай пазыкі для ўзмацненьня дзяржаўных рэсурсаў, накіроўваемых на справу індустрыялізацыі краіны і на цесна зьвязаную з імі справу дзяржаўнае абароны.

Большасьць рэзалюцый супала па часу з бандыцкім налётам кітайскае ваеншчыны на КУЧ і такім чынам, патрабаваньне выпуску новай пазыкі зьявілася адказам на наглую правакацыю кітайскіх генэралаў, адказам, які сьведчыць аб моцнай і непарушнай волі ўсёй нашай рабочай клясы да барацьбы за стварэньне сацыялістычнага грамадзтва і ўзмацненьне абароназдольнасьці савецкае краіны. Лёзунг кампаніі сярод рабочых павінен быць:

«Месячны заработак—на пазыку». Уся рабочая кляса, усе члены прафсаюзаў, усе працоўныя павінны аднадушна адгукнуцца на дэкрэт аб выпуску пазыкі. Арыентыровачныя разьлікі паказваюць, што пры энэргічным разгортваньні кампаніі нам удасьцца разьмеркаваць сярод рабочых і служачых аблігацыі новай пазыкі на суму ня менш 500 мільёнаў рублёў. Калектыўная падпіска сярод рабочых і служачых па другой пазыцы індустрыялізацыі дала 415 мільёнаў рублёў. Ня прыходзіцца сумнявацца, што задачу разьмеркаваньня 500 мільёнаў сярод рабочых і служачых нам удасца спрыяюча вырашыць. Рэшту пазыкі ў разьмеры 250 мільёнаў рублёў мяркуецца распаўсюдзіць сярод сялянства і неарганізаванага гарадзкога насельніцтва (асоб вольнае прафэсіі, саматужнікаў, рамесьнікаў, хатніх гаспадынь і г. д.).

Пры энэргічным разгортваньні работы і пры правільным і неаслабным партыйным кіраўніцтве, работа дасьць свае плёны і справа сацыялістычнай індустрыялізацыі нашай краіны, з якою зьвязаны ўзьняцьце і абароназдольнасьць і павышэньне матар'яльнага дабрабыту шырокіх працоўных мас, атрымае новы вялізны штуршок наперад.

(«Правда»).

Адказ працоўных СССР кітайскім белабандытам

Масавая падпіска на 3-ю пазыку і на самалёт

МАСКВА, 25. Рабочыя 3-га вучастку Турксібу адлічылі ў фонд абароны аднадзенны заработак. Сяляне некалькіх сёл Сяміпалацінскае акругі адлічылі ў фонд абароны на аднаму кілё збожжа з кожнага гэктару пасеву. Валагодская газэта «Красный Север» адкрыла кампанію за пабудову самалёту «Імя Паўночнага Краю».

Сяляне с.-г. камун Прыморска-Аштаркай, Кубанскае акругі і Прахладнінскай, Тераксакае акругі на станічным сходзе пастанавілі ўсім падпісацца на пазыку індустрыялізацыі. Прахладненцы ўнесьлі 100 руб. на пабудову эскадрыльлі «Наш адказ Чан Кай-шы». Паступае яшчэ шмат тэлеграм аб узмоцненай падпісцы на трэцюю пазыку індустрыялізацыі.

У Ленінградзе 24-га ліпеня папярэдняя падпіска на трэцюю пазыку індустрыялізацыі дасягнула 675.000 руб. 90 рабочых інструмэнтальнага цэху заводу імя Кулакова падпісаліся на 17.000 руб. Большасьць з іх падпісалася па суму, якая перавышае двухмесячны заробак.

У Волагдзе пачалася датэрміновая падпіска на трэцюю пазыку індустрыялізацыі. Першы дзень падпіскі даў звыш 3.000 руб. Рабочыя Яшкінскага цэмэнтнага заводу, які знаходзіцца недалёка Томску, і сяляне трох ваколічных вёсак пасьля мітынгу і дэманстрацыі пратэсту супроць захопу КУЧ абвясьцілі папярэднюю падпіску на трэцюю пазыку. За два дні падпіска дала 13.000 руб. На адным з сходаў хатніх працаўніц у Краснадары падпіска на трэцюю пазыку ў працягу паўгадзіны дала 1.100 руб. Краснадарскія чыгуначнікі падпісаліся на 4.000 руб.

Наркамфін СССР тав. Бруханаў аб значэньні 3-й пазыкі індустрыялізацыі

МАСКВА, 25. У гутарцы аб значэньні 3-й пазыкі індустрыялізацыі Наркамфін СССР т. Бруханаў паведаміў:

3-я пазыка індустрыялізацыі зьяўляецца арганічнай часткаю фінансавай базы гаспадарчага пляну 1929-30 году, другога году пяцігодкі. Сума пазыкі 750 мільёнаў тлумачыцца патрэбнасьцямі шырокага сацыялістычнага будаўніцтва, прадугледжанага пяцігодкаю на новы год. Практыка апошніх год паказала, што ўнутраныя пазыкі становяцца ўсё больш магутнай зброяй паскарэньня нашай сацыялістычнай рэканструкцыі. Вялізнае значэньне пазыкі заключаецца ў доўгатэрміновасьці крэдытаў, якія дастаўляюцца праз яе дзяржаве. Нежаданьне трымаць аблігацый на руках рашуча асуджваецца ўсёй нашай савецкай грамадзкасьцю. Удзел у пазыцы, апрача ўсяго прыносіць зусім выразныя і непасрэдныя выгады трымальніку пазыкі. На жаль, да гэтага часу значная маса насельніцтва, асабліва сялянства, надзвычайна слаба асьведамлена ў пытаньнях дзяржкрэдыту і ў выгадах нашых пазык. Трэба зараз-жа мабілізаваць увесь наш партыйны і савецкі актыў, усю нашу грамадзкасьць для шырокага азнаямленьня працоўных гораду і вёскі з мэтамі, умовамі і выгадамі пазыкі і для арганізаванага правядзеньня кампаніі па яе разьмеркаваньні.

Наглая хлусьня ангельскага друку

Гутарка з тав. І. С. Уншліхтам

МАСКВА (Наш кар.).

«Савецкая авіяцыя бамбардыравала ст. Пагранічная. Савецкія войскі заняялі станцыі Пагранічная і Манчжурыя».

Такія паведамленьні ў апошнія дні ўсё часьцей зьмяшчаюцца ў ангельскіх рэакцыйных газэтах.

Намесьнік старшыні Рэвваенсавету т. Уншліхт па поваду гэтых паведамленьняў заявіў нашаму карэспандэнту:

— Гэта наглая хлусьня, нічым ня прыфарбаваная правакацыя. Чырвоная армія даволі моцная, каб ня ісьці на правакацыю.

ХАРБІН ПАСЬЛЯ ЗАХОПУ КІТ.-УСХ. ЧЫГУНКІ

Арышты рабочых і служачых К.-Усх. чыгункі ня спыняюцца.--400 настаўнікаў у знак пратэсту пакінулі сваю працу

Белагвардзейцы падрыхтоўваюць яўрэйскі пагром

ХАБАРАЎСК, 24. Праз граніцу праехала чарговая партыя супрацоўнікаў КУЧ і савецкага консульства ў Харбіне. Таварышы перадаюць, што кітайская ўлада арыштоўвае рабочых і служачых КУЧ і іншых грамадзян без прад'яўленьня ім якіх-небудзь абвінавачаньняў. 400 настаўнікаў школ для дзяцей савецкіх грамадзян—рабочых і служачых КУЧ падалі заяву аб звальненьні ў знак пратэсту супроць захопніцкіх учынкаў кітайскай улады. Фын Цын-чуан, якога кітайская ўлада назначыла на месца т. Емшанава, у пісьмовай форме зьявярнуўся да настаўнікаў узяць свае заявы назад. Настаўнікі катэгарычна ад гэтага адмовіліся.

Новае кіраўніцтва КУЧ адзначаецца страшэннай безгаспадарчасьцю. На чыгунцы зрабіўся затор—стаяць некалькі тысяч вагонаў хлеба; пачаліся рабаўніцтвы з боку хунхузаў, якія жывуць на выспах Сунгары. У Харбіне вялікая паніка. Купцы і чыноўнікі вывозяць свае сем'і і тавары. Зьдзелкі на біржы спыніліся. Адбылося нечарговае пасяджэньне біржавога камітэту, але карысьці ад яго мала, бо закрыліся ўсе тры банкі.

Ходзяць упартыя чуткі аб падрыхтоўцы белагвардзейцамі яўрэйскага пагрому ў Харбіне. Гэтыя чуткі выклікаюць сур'ёзную небясьпеку Харбінскае яўрэйскае вобшчыны. Белагвардзейцы трымаюць сябе абураюча.

Генэрал Сокалаў пры згодзе і падтрыманьні кітайскай ваеншчыны арганізуе партызанскі атрад у 1.200 чалавек. На станцыі Пагранічная, кітайцы разам з белагвардзейцамі разбурылі памяшканьне, якое належыць забайкальскай чыгунцы.

ШТО ПРАПАНУЕ АНГЕЛЬСКІ РЭАКЦЫЙНЫ ДРУК НАНКІНСКАМУ ЎРАДУ

ШАНХАЙ, 24. Ангельскі рэакцыйны орган «Норд Чайна Дэйлі Ньюс» прапануе ў перадавым артыкуле яшчэ да вырашэньня пытаньня перадаць КУЧ пад часовы кантроль міжнароднай камісіі. Газэта канстатуе, што нанкінскі ўрад зьмяніў тон у адносінах да СССР, бо на яго, бясспрэчна, вельмі цяжкае ўражаньне зрабіла адмоўная крытыка яго дзеяньняў нават з боку яго лепшых прыяцеляў.

Зазначаючы, што СССР «захоўвае «зловещее» маўчаньне», у той час, як усе гаворыць, газэта рэкамэндуе нанкінскаму ўраду перадаць кантроль над КУЧ нэйтральным асобам да канчатковага вырашэньня пытаньня, бо гэты крок значна ўмацуе яго пазицыю ў вачох усяго сьвету, сьмпатыі якога ўжо схіліліся ў бок нанкінскага ўраду, калі ён выканаў гатоўнасьць перадаць канфлікт у трэцейскі суд. (ТАСС)

МІЖНАРОДНЫ ЧЫРВОНЫ ДЗЕНЬ У ПОЛЬШЧЫ

З вялікім напружаньнем праходзяць апошнія дні перад Міжнародным Чырвоным днём барацьбы супроць ваеннай небясьпекі. Увесь сусьветны пралетарыят пад кіраўніцтвам Камуністычнага Інтэрнацыяналу рыхтуецца да масавых і баявых выступленьняў у дзень 1-га жніўня пад лёзунгамі абароны Савецкага Саюзу, барацьбы з надыходзячай вайной, пад лёзунгамі рэвалюцыі. На гэтую падрыхтоўку міжнародны імпэрыялістыя адказваюць жорсткай барацьбой з малейшым праяўленьнем камуністычнай агітацыі ў масах, шалёным цкаваньнем Савецкага Саюзу, узмацненьнем белага тэрору.

Узмоцнена рыхтуецца да 1-га жніўня і рабочая кляса Польшчы. На апошнім пленуме Камуністычнага Інтэрнацыяналу справядліва адзначалася, што камуністычная партыя Польшчы ня гледзячы на сваю нелегальнасьць і надзвычайна цяжкія ўмовы барацьбы, ідзе ў першых радох Камуністычнага Інтэрнацыяналу ў справе падрыхтоўкі першажніўненьскіх выступленьняў. Камуністычная партыя Польшчы прыцягвае весьці барацьбу супроць ваеннай небясьпекі на найбольш адказны вучастку міжнароднага рэвалюцыйнага фронту.

Фашысцкая Польшча зьяўляецца перадавым атрадам сусьветнага імпэрыялізму ў яго антысавецкіх ваенных плянах. У Польшчы мае ўладу «палкоўнікі» ўрад, гэроі ваенных авантур, верныя выканаўцы ваенных намераў і пляноў англа-французкага імпэрыялізму. Фашысцкая Польшча ліхаманкава рыхтуецца да вайны. Гэта падрыхтоўка перш за ўсё накіравана супроць Саюзу Савецкіх Рэспублік, супроць савецкіх Беларусі і Украіны. Уся замежная палітыка польскага фашысцкага ўраду характарызуецца гэтай асноўнай кіруючай рысай.

Імкненьне да стварэньня ваенных саюзаў з радам буржуазных дзяржаў, заключэньне разнастайных дагавораў, накіраваных супроць Савецкага Саюзу—вось праяўленьне замежнай палітыкі польскага імпэрыялізму. Ваенны саюз Польшчы з Румыніяй носіць выключна антысавецкі характар. Згодна дагавору, які існуе паміж Польшчай і Румыніяй ужо з 1921 г., згодна польска-румынскай ваеннай канвэнцыі, заключанай у 1926 г., у выпадку ваеннай сутычкі з Савецкім Саюзам адной з гэтых дзяржаў, другая дзяржава аўтаматычна ўступае ў вайну з СССР і мабілізуе адразу-ж усе свае ўзброеныя сілы.

Частыя ўзаемныя паездкі і візыты прадстаўнікоў польскага і румынскага генштабаў маюць на мэце ўмацаваньне ваенна-палітычных сувязяў, усім вастрым сваім накіраваным супроць пралетарскае дзяржавы. Цеснае ваеннае супрацоўніцтва, якое існуе паміж Францыяй і Польшчай, таксама носіць антысавецкі характар. Сакрэтам Палішынэля зьяўляецца факт рэгулярнай дастаўкі французкім урадам Польшчы вялікае колькасьці вінтовак, кулямётаў, знарадаў і ваенных самалётаў. У Шэрбургскім порце абсталявана спэцыяльная польская ваенная база, куды прыбываюць з французкіх заводаў усе ваенныя маемасьць, прызначаная для Польшчы. Паміж Шэрбургскім портам і Данцыгам арэбіць рэгулярныя рэйсы параход «Вілія», які спэцыяльна прыстасаваны для перавозкі прадметаў ваеннае амуніцыі.

Калі мы паглядзім на **ўнутраную** палітыку польскага фашызму, то і яна спачатку да канца характарызуецца ўзмоцненай падрыхтоўкай да вайны. У той час, калі ўся прамысловасьць Польшчы перажывае глыбокі гаспадарчы крызіс, калі дзесяткі тысяч рабочых выкідваюцца на вуліцу, калі беспрасьветная галеча і голад ахапляе рабочыя кварталы і бядняцкія хаты вёсак, у гэты час **дзьве трэці ўсяго дзяржаўнага бюджэту працыцца на ваенныя патрэбы.** У 1927-28 г. г. польскі ўрад выдаткаваў 1 мільярд 25 мільёнаў злотых на патрэбы армії і ваенная прамысловасьці. Ваенная прамысловасьць Польшчы перажывае пэрыяд росквіту. За кошт выкачваньня з працоўных пластоў насельніцтва шляхам падаткаў, вялізэнных сродкаў, за кошт бязьмежнай эксплёатацыі рабочае клясы, польскі фашызм будуе новыя ваенныя заводы. Калі ў 1923-24 г. г. у польскай ваеннай прамысловасьці было занята ўсяго 7-8 тысяч рабочых, то ў 1928-29 г. г. у ваеннай прамысловасьці працуе каля 50 тысяч рабочых. За гэтыя гады агульная прадукцыя ваенных заводаў Польшчы дасягнула 50 мільёнаў даляраў у год.

Польшча ўжо зараз утрымлівае вялікую армію, якая вырасла з 1923 г. амаль на 30 проц. Адначасова з падрыхтоўкай арміі фашысцкі ўрад зьвяртае вялікую ўвагу на падрыхтоўку і стварэньне спэцыяльных ваенна-фашысцкіх саюзаў гэтай гвардыі Пілсудзкага. Такія арганізацыі, як «Стралец», саюз легіянэраў, розныя ваенна-спартыўныя таварыствы служаць ваенным задачам польскага фашызму і задачам па барацьбе з узрастаючым рэвалюцыйным рухам працоўных мас.

Само існаваньне Савецкага Саюзу зьяўляецца пагрозай польскаму фашызму. Прыклад рабочых і сялян Савецкай Беларусі і Савецкай Украіны рэвалюцыянізуе працоўныя масы так званых крэсаў. Рост сацыялістычнае гаспадаркі ў краіне саветаў рэвалюцыянізуе працоўныя масы ўсёй Польшчы. **Таму вайна, што падрыхтоўваецца польскімі імпэрыялістымі супроць Савецкага Саюзу, будзе зьяўляцца вайной клясавай, вайной польскіх памешчыкаў і капіталістых супроць рабоча-сялянскае дзяржавы.** Польскаму імпэрыялізму трэба вадушыць краіну рэвалюцыі, дзяржаву пралетарскай дыктатуры. Польскім памешчыкам і капіталістым патрэбны равам з гэтым рынкі савецкай Беларусі і савецкай Украіны, і таму імпэрыялістычная экспансія Польшчы на Усход зьяўляецца адной з кардынальнейшых прычын узмоцненай падрыхтоўкі супроць СССР.

Побач з ваенна-тэхнічнай падрыхтоўкай вайны супроць СССР польскі фашысцкі ўрад вядзе і палітычную падрыхтоўку гэтай вайны. Пастаяннае цкаваньне Савецкага Саюзу, пашырэньне ўсякіх нябыліц аб жыцьці рабочых і сялян савецкай Беларусі і Украіны, шалёныя атакі на нацыянальную палітыку камуністычнай партыі бальшавікоў Беларусі і Украіны—усё гэта зьяўляецца зьвеньнямі аднаго ланцугу—ідэолёгічнай падрыхтоўкі да вайны супроць СССР. Варта ўзяць хоць-бы апошні зьезд палякаў, што жывуць за мяжою, які, да рэчы сказаць, праваліўся з трэскам, для таго, каб убачыць, што і гэта падзея была скарыстана для антысавецкай дэманстрацыі. Спрабуючы замазаць поўны правал гэтага зьезду, яго пілсудчыкаўскія патхніцелі правялі на зьезьдзе рэзалюцыю, спэцыяльна накіраваную супроць Савецкага Саюзу і працягваючую руку салідарнасьці контр-рэвалюцыйным элемэнтам тут у СССР.

Ваенным задачам польскага фашызму служыць і тая барацьба, якую вядзе польская буржуазія супроць узрастаючага рэвалюцыйнага руху рабоча-сялянскіх мас Польшчы. Самы разбэшчаны белы тэрор зьяўляецца адным з самых важных і самых патрэбных срэдкаў ваеннай падрыхтоўкі польскага фашызму.

Апошні пленум ВККІ зусім правільна ахарактарызаваў ролю міжнароднай сацыял-дэмакратыі ў вайне, якая падрыхтоўваецца, **як ролю ваяўнічага атраду міжнароднага імпэрыялізму.** У гэтых адносінах ППС зьяўляецца, бадай, найбольш актыўным і найбольш адкрытым выканаўцаю ваенных плянаў імпэрыялістых. Польскія сацыял-фашысты проста прыкрываюць антысавецкую палітыку польскіх імпэрыялістых. У адносінах да замежнай палітыцы польскага ўраду ППС не знаходзіць ніякіх іншых слоў, акрамя палкіх водгукаў і воклічаў аб «мірнай» палітыцы ўраду Пілсудзкага. Усе ваенныя пляны ўраду актыўна падтрымліваюцца ППС. ППС у сойме галасуе за павялічэньне ваенных бюджэтаў.

З дня ў дзень пэпэсаўская прэса вядзе самае агіднае цкаваньне Савецкага Саюзу. У рабочай клясе ППС выконвае ролю вернага агента польскага фашызму, які сваёй пацыфісцкай балбатнёй усыпляе рэвалюцыйную пільнасьць пралетарскіх мас і разбройвае іх перад т

Вышэй сьцяг баявога інтэрнацыяналізму!

НА ПРАВАКАЦЫЮ ВАЙНЫ СУПРОЦЬ СССР АДКАЖАМ УЗМОЦНЕНАЙ ПАДПІСКАЙ НА 3-ю ПАЗЫКУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ І ПАВЫШЭНЬНЕМ ВЫТВОРЧАСЬЦІ ПРАЦЫ

Да ўсіх рабочых і работніц кастрычнікавага раёну

VI Кангрэс Камуністычнага Інтэрнацыяналу пастанавіў правесьці Міжнародны Чырвоны Дзень, як дзень агляду і дэманстрацыі сіл сусьветнага пралетарыяту супроць новай імпэрыялістычнай вайны, супроць буржуазіі і пе служкаў—сацыял-дэмакратаў.

Ніколі яшчэ ня была так блізка пагроза вайны супроць СССР—першай краіны дыктатуры пралетарыяту, апоры сусьветнай рэвалюцыі—як зараз. Ужо першая выпазка зроблена. Кітайскія сатрапы-каты дзесяткаў тысяч кітайскіх рабочых і сялян з непасрэднага благаславеньня міжнароднага капіталу зрабілі разбойніцкі захоп Кітайскай Усходняй чыгункі.

Белагвардзейскі атаман Сямёнаў, нахлебнік японскага капіталу, ужо рыхтуе белагвардзейскія атрады для перакідкі праз нашу граніцу.

Панская Польшча Пілсудзкага абярнулася ў зьезд зарубежных палякаў, у зьезд фашыстых для падрыхтоўкі вайны супроць Савецкага Саюзу.

Міжнародны пралетарыят разгортвае барацьбу супроць небясьпекі новых войн за абарону СССР. Мы вітаем нямецкіх матросаў, якія адмовіліся перавозіць аружжа бандыта Чан Кай-шы. Мы шлем свае брацкае прывітаньне гэраічным пралетарам Бэрліну, мужным абаронцам барыкад Нойкёльну і Вэдынгу.

Дзень 1-га жніўня павінен стаць днём умацаваньня брацкай салідарнасьці з пралетарамі і працоўнымі капіталістычных краін. Перад тварам узрастаючай ваеннай небясьпекі—ВЫШЭЙ СЬЦЯГ БАЯВОГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМУ РАБОЧЫХ І ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ СССР.

Рабочая кляса нашай краіны пад кіраўніцтвам загартаванай бальшавіцкай партыі, не пакпадаючы рук, з вялізарным энтузіязмам будзе разгортваць сацыялістычнае будаўніцтва—новы крок да ўмацаваньня абароназдольнасьці СССР, новы ўдар па сусьветным капіталізьме.

Рабочыя і работніцы, памятайце!

Парукаю посьпеху нашага разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва зьяўляецца актыўны ўдзел ў гэтай справе ўсіх рабочых, усіх працоўных.

Наша будаўніцтва сацыялізму—частка сусьветнай рэвалюцыйнай барацьбы. Вышэй дысцыпліну, больш арганізаванасьці ў працы. Усе на сацыялістычнае спаборніцтва.

Абкружым ампалатам і ўвагай Чырвоную армію—меч прыгнечаных, аружжа пралетарскай рэвалюцыі, узброены атрад сусьветнага пралетарыяту.

У адказ на правакацыю вайны супроць СССР адкажам згуртаваньнем наўкол ленінскай партыі ўзмоцненай падпіскай на трэцюю пазыку індустрыялізацыі, павышэньнем вытворчасьці працы і рашучай барацьбой з гультаямі і прагульшчыкамі.

28-га ліпеня ў сад «Прафінтэрн» Кастрычнікавы райком КП(б)Б заклікае ўсіх пралетараў і пралетарак зьявіцца на раённы партыйны сход, дэманструючы гэтым сваю шчырую адданасьць партыі, гатоўнасьць у любы час стаць з аружжам у руках на абарону сацыялістычнае бацькаўшчыны.

КАСТРЫЧНІКАВЫ РАЙКОМ КП(б)Б.

Апошнія маскоўскія навіны

(Ад нашага карэспандэнта)

Здаюць аблігацыі на каваньне

У кіраўніцтве ашчадными касамі нам паведамілі, што ўжо звыш 30 проц. усіх трымальнікаў другое пазыкі індустрыялізацыі здалі свае аблігацыі на калектыўнае каваньне.

Створыць жывёлаводчыя гаспадаркі

Заява т. Мікаяна

У гутарцы з нашым карэспандэнтам Наркамгандаль СССР т. Мікаян падкрэсьліў, што з будучага году ў мэтах узмацненьня барацьбы з недахватам мяса прыдзецца зьвярнуць вялікую ўвагу на стварэньне буйных жывёлаводчых гаспадарак. Труднасьці ў справе забесьпячэньня—сказаў т. Мікаян—гэта труднасьці росту. Спажываньне хутка расьце. Даволі сказаць, што кожны масквіч (гэта адзінкавы прыклад) зьядае ў год 105 кілё мяса. Нормы дарэвалюцыйнага спажываньня мяса—далёка адстаюць.

Сацыялістычнае спаборніцтва на заводзе „Красный Путиловец"



На заводзе арганізаваны дзесяткі ўдарных брыгад і паказальных груп. Асабліва энэргічна і сьвядома праводзіцца работа ў трактарных майстэрнях.

На здымку: Ударная група рабочых у трактарным цэху абгаварвае магчымасьць папелішаньня рухавікоў унутранога згараньня.

Расстрэл 16 белагвардзейцаў у Забайкальлі

Белагвардзейцы былі прысланы кітайскаю ўладаю з мэтаю шкодніцкіх актаў

ХТО ЯНЫ?

МАСКВА, 24. 22-га ліпеня пры пераходзе нашай граніцы ў Забайкальлі органамі ДПУ былі арыштаваны белагвардзейцы: Раздабрэеў, Бародкін, Няпомняшчы і інш. Бандыты былі ўзброены гранатамі і рэвальвэрамі з вялікай колькасьцю патронаў. Расьсьледваньнем устаноўлена, што банда перайшла на нашу тэрыторыю па заданьнях і пры поўнай дапамозе кітайскіх улад з мэтаю шкодніцкіх актаў (узрывэў чыгуначных мастоў, агнясклядаў, баз).

17-20 ліпеня ў Амурскім раёне затрыман яшчэ рад расійскіх белагвардзейцаў, якія пераходзілі дзяржаўную граніцу для анапёгічных учынкаў.

АДПУ у сваім судовым пасяджэньні ад 23-га ліпеня бягучага году, разгледзіўшы справы ніжэйпамянёных белагвардзейцаў—бандытаў: 1) Дуканава В. Л., двараніна, былога палкоўніка, які з 1924 г. займаўся бандыцкай дзейнасьцю, рабіў сыстэматычныя налёты на савецкую тэрыторыю і затрымаграна пры нелегальным пераходзе савецкае граніцы з дыверсыйнымі і тэрарыстычнымі мэтамі; 2) Пасхалава Г. С., былога паліцэйскага агента харбінскай контррэвалюцыйнай арганізацыі генэрала Сахарава, які зараз па заданьні штаба кітайскіх войск фарміруе атрады і групы белагвардзейцаў для узброенага нападу на нашу тэрыторыю і які стаіць на чале манархічнай арганізацыі «Далёка-Ўсходні корпус расійскіх добраахвотнікаў»; 3) Гарліна А. І., былога паручыка калчакоўскае армії, які накіроўваўся ў СССР з тэрарыстычнай мэтай; 4) Акліна М. А., буйнога купца, кантрабандыстага, члена фашысцкае арганізацыі; 5) Мацьвеева Я. Ф., былога харунжага, удзельніка многіх бандыцкіх выступленьняў на Амуры; 6) Мурганцава Г. І., былога белага афіцэра, які накіроўваўся ў СССР для дыверсыйных і тэрарыстычных актаў; 7) Сэрбіенка Д. Ф.—афіцэра—дабраахвотніка Сямёнаўскае арміі, удзельніка карнае экспедыцыі Меркулава, члена манархічнае арганізацыі, былога генэрала Харвата, які перайшоў на савецкую тэрыторыю з тэрарыстычнай мэтай; 8) Сэвераніна М. С., члена тэй-жа арганізацыі; 9) Зуева М. Ф.—члена тэй-жа арганізацыі; 10) Вараціхіна М. С.—выдатнага ўдзельніка банды Арестаўлова, якая субсідуецца кітайскімі ўладамі; 11) Цёмкіна А. Ф., які ня раз удзельнічаў ў бандыцкіх налётах на нашу тэрыторыю; 12) Раздабрэева А. М., затрыманага пры пераходзе дзяржграніцы ў трэйці раз па даручэньні белагвардзейца Патэфуліна, выдатнага дзеяча контр-рэвалюцыйнае арганізацыі, на чале якой стаіць палкоўнік Назараў Ф. Т. Назараў прыехаў з Парыжу ў Харбін для арганізацыі белапартызанскіх атрадаў, узброеных налётаў на нашу тэрыторыю, тэрарыстычных актаў і інш. (Раздабрэеў меў заданьне арганізаваць у Забайкальлі ячэйкі Назараўскае арганізацыі. Назараў Ф. Т. працуе пры поўным падтрыманьні кітайскіх улад); 13) Саратціна А. А. члена назараўскае арганізацыі; 14) Бондарава І. І., члена тэй-жа арганізацыі; 15) Няпомняшчага А. А.—члена Назараўскай арганізацыі; 16) Хлебцава І. В.—удзельніка бандыцкіх налётаў на Амуры, члена фашысцкае арганізацыі—пастанавіла: УСІХ ПЕРАЛІЧАНЫХ ВЫШЭЙ АСОБ — РАССТРАЛЯЦЬ. Прыгавар выканан.

ПРАДСТАЎНІКІ АНГЕЛЬСКІХ ЛЕСАІМПОРТНЫХ ФІРМ У МАСКВЕ

МАСКВА, 24. Супрацоўнік ТАСС меў гутарку з прыехаўшымі ў Маскву прадстаўнікамі буйнейшых ангельскіх леса-імпортных фірм Майэрэм Стым і Арнот. Яны заявілі, што падарожжа ангельскіх лесаімпарцёраў у СССР мае на мэце ўзмацненьне тых адносін, якія існуюць паміж ангельскімі лесаімпортнымі фірмамі і савецкай імпортнай прамысловасьцю, а таксама, каб пашырыць гандаль паміж імі. Стым, а таксама і Арнот зазначаюць, што савецкія экспарцёры лесу вельмі дакладна і акуратна, дзень у дзень выконваюць свае абавязкі па дастаўцы тавару патрэбнае якасьці і ў адпаведнай колькасьці. У ангельскіх дзелавых колах,—заявіў Арнот,—будуць вітаць аднаўленьне адносін паміж Англіяй і СССР, бо гэта дасьць магчымасьць пашырыць гандлёвыя зносіны паміж абедзьвюма краінамі.

Як яны рыхтуюцца да вайны

З брашуры францускае кампартыі

Цэнтральны орган францускай кампартыі «Юманітэ» выпусьціў дармовым дадаткам брашуру «Як яны рыхтуюцца да вайны». Гэта брашура ўяўляе сабою збор дакладных даных (пастаянае афіцыйных паведамленьняў) і фактаў, якія даюць яскравы малюнак таго, як ліхаманкава рыхтуюцца міжнародныя імпэрыялістыя да новай бойні паміж сабою і да паходу супроць СССР.

70 мільярдаў на бойню

Францыя, Амэрыка, Англія, Японія і Італія трымаюць зараз стала пад зброяй каля 3 мільёнаў чалавек. Суседзі СССР—Фінляндыя, Эстонія, Латвія, Польшча і Румынія, якія адыгрываюць ролю часудхмянае зброі ў руках буйных капіталістычных дзяржаў, мелі ў 1928 годзе 60.000 чалавек пад зброяй (цяпер гэта колькасьць вырасла).

У 1913 годзе лік вайскова-навучаных пяці памянёных буйных імпэрыялістычных дзяржавах складаў прыблізна 3 мільёнаў чалавек, цяпер гэты лік складае вялікую лічбу ў 20 мільёнаў чалавек.

Запытаньне, навошта трымаліся-б такія вялізныя арміі, калі-б вайна не стаяла на парадку дня.

Затраты на ўзбраеньне растуць разам з балбатнёю аб разбраеньні. Замест 3 і больш мільярдаў франкаў (франк каля 7 з палов. кап.), якія былі затрачаны на ваенныя патрэбы ў 1913 годзе, зараз тымі-ж 5 імпэрыялістычнымі дзяржавамі асыгнавана 70 мільярдаў. Толькі за тры апошнія гады ваенныя асыгнаваньні гэтых дзяржаў павялічыліся на 36 мільярдаў.

Амэрыка затраціла ў 1928-29 годзе для 10 мільярдаў на флёт. Англія ў тым-жа 1928-29 годзе затраціла на флёт больш 8 мільярдаў, што ў параўнаньні з мінулым годам дае павялічэньне на 12 проц. А Францыя за гэты-ж час павялічыла выдаткі на 40 проц.

Выдаткі на паветраны флёт павялічыліся ў сярэднім для тых-жа пяці дзяржаў амаль у тры разы, пачынаючы з 1923 году і дасягілі вялізнае сумы ў 8 мільярдаў франкаў.

Усё гэта, напамінаем, паводле афіцыйных моцна зьменшаных даных.

Гэты непарыўны рост выдаткаў на ваеннае ўзбраеньне ідзе ня толькі за кошт колькасьці ўзбраеньняў, але і якасьці. Імпэрыялістыя маюць цяпер у сваім распараджэньні такія страшэнныя сродкі зьнішчэньня, аб якіх і паміну ня было ў мінулую імпэрыялістычную вайну.

Верныя слугі імпэрыялістых, якія акружаюць СССР, старанна ідуць на прыкладу сваіх гаспадароў. Асабліва адзначаецца Польшча. Яна ўзбройваецца з такой шпаркасьцю, што ўжо нагадвае сабою хутчэй узброены лягер, чым мірную краіну. Ліхаманкавае ўзбраеньне Польшчы, якое магчыма толькі дзякуючы дапамозе імпэрыялістычных дзяржаў, і ў першую чаргу Францыі, гаворыць аб тым, што пагроза вайны больш за ўсё накіравана супроць вайны.

Ваенныя выдаткі Польшчы на 1929-1930 год павялічаны больш, як на 55 мільёнаў злотых у параўнаньні з 1928-29 г. Лік рабочых ваеннай прамысловасьці дасяг у 1928 г. 65.000 замест 21.000 у 1926 г.

У адным горадзе—сто фабрык ваеннае амуніцыі

Францускія рабочыя і сяляне выплачваюць у гэтым годзе 70 мільярдаў франкаў падатку. З кожнай сотні франкаў падатку, выплачваемых працоўнымі, 60 франкаў ідзе для выплаты ваенных даўгоў іншым дзяржавам, 20 франкаў—на падрыхтаваньні да будучае вайны, 14 мільярдаў франкаў затрачвае Францыя ў гэтым годзе на падрыхтоўку да новае вайны. Калі такія грошы асыгнаваць на павялічэньне зарплаты рабочым, дык кожны рабочы мог-бы штодня атрымаць дадаткова па 5 франкаў.

Гэтыя вялізныя выдаткі выклікаюцца і страшэннаю нажываю прадпрыемцаў ваеннай прамысловасьці. Штогодныя прыбыткі гэтых панаў вылічваюцца дзесяткамі і сотнямі мільёнаў франкаў. Так, прыбытак фабрык Лёнскае акругі (Францыя), якія вырабляюць атрутныя газы, дасягла ў 1928 годзе 173 мільёнаў. Каб атрымаць прадстаўленьне аб колькасьці прадпрыемстваў, што працуюць выключна на вайну, досыць паказаць, што ў адной толькі акрузе Сены (Францыя) ёсьць больш ста фабрык ваеннае амуніцыі.

Асаблівая ўвага зьвернута цяпер на выраб атрутных газаў. У брашуры, выданай «Юманітэ», падаецца доўгі сьпіс прадпрыемстваў, якія вырабляюць гэтыя газы.

Патайныя дагаворы і адкрытыя ўціскі

Побач з агульнымі рыхтаваньнямі да вайны вядуцца рыхтаваньні да паходу супроць СССР. Згодна пункту 10 сакрэтнага франка-польскага ваеннага дагавору, Францыя абавязваецца арганізаваць ваенны савет для кіраўніцтва апэрацыямі польскай арміі супроць СССР. Яна абавязваецца таксама папоўніць кадры польскіх афіцэраў францускімі, забясьпечыць польскую армію ваеннымі прыпасамі і блёкаваць пры дапамозе флёту расійскае ўзьбярэжжа.

Францыя занята вырабам ваеннае амуніцыі для Польшчы.

Румынскі буржуазны друк адкрыта гаворыць аб дагаворанасьці паміж Румыніяй і Польшчай па гэтым-жа пытаньні.

На чале польскай, чэхаславацкай, румынскай і паўднёва-слаўскай армій стаяць францускія генэралы. Афіцэры францускага ваеннага штабу выкладаюць у вайсковых навучальных установах гэтых краін. У ваенных выдатках Францыі на 1929 год прадугледжана 15 мільёнаў франкаў на выплату 93 афіцэрам, якія прыкамандыраваны да Польшчы і іншых краін.

Адначасова з падрыхтоўкаю да вайны ўзмацняецца націск на рэвалюцыйныя арганізацыі рабочае клясы. Ліга нацый пераробленa ў інструмант, які павінен усьпішць пільнасьць рабочых. Работа гэтай Лігі, прысьвечаная гутаркам аб разбраеньні, займае 14 тысяч старонак паперы. Калі мы да іх дадамо мільёны тон паперы розных часопісяў, якія гаворваць аб разбраеньні, дык атрымаем некаторае ўяўленьне аб тым ашуканстве грамадзкае думкі, якое вядуць капіталістыя пры дапамозе сацыялістых.

Супроць камуністычных партый вядзецца сыстэматычнае наступленьне, най больш актыўных таварышоў кідаюць у турмы. Ва ўсім гэтым як і ў ваеннай падрыхтоўцы, сацыялістыя аказваюць буржуазіі ўсялякую дапамогу. Адносины сацыял-дэмакратаў да вайны знайшлі яскравае адлюстраваньне ў заяве аднаго з правадыроў францускіх сацыялістых, выдатнага дзеяча II-га Інтэрнацыяналу Рэнодэля, які заявіў, што няма ніякага разыходжаньня паміж паняцьцем сацыялізму і ідэяй нацыянальнай абароны, паміж арганізацыяй арміі для абароны капіталістычнае бацькаўшчыны і сацыялізму.

ЗЬЕЗДА

ГЕНЭРАЛЬНАЯ ПРАВЕРКА І ЧЫСТКА ПАРТЫЙНЫХ РАДОЎ

ПАРТКАЛЕГІЯ ЦКК ПРАВЯРАЕ ХОД ЧЫСТКІ

Як праходзіць праверка і чысткаў Магілеўскай і Аршанскай акруговых партарганізацыях

Парткалегія ЦКК КП(б)Б на сваім апошнім пасяджэньні, якое адбылося 24-га ліпеня, заслухала даклады старшыні Магілеўскай АКК КП(б)Б т. Жолудава і старшыні Аршанскай АКК т. Сьвірыдава аб ходзе праверкі чысткі ў гэтых партарганізацыях.

ПА МАГІЛЕЎСКАЙ АКРУГОВАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

Дакладчык т. Жолудаў адзначыў, што падрыхтоўчая работа па праверцы і чысткі Магілеўскай арганізацыі пачалася з сьнежня месяца. Была праведзена адпаведная работа па растлумачэньні задач чысткі сярод партыйных і беспартыйных працоўных мас, былі складзены характарыстыкі на ячэйкі і праведзены падбор кандыдатур у праверкомы. Па ацэнцы акруговай Кантрольнай Камісіі падрыхтоўчая работа ўвогуле па арганізацыі праведзена здавальняюча. Аднак, некаторыя ячэйкі і райкомы падрыхтоўку правялі ня зусім добра. У некаторых раёнах характарыстыкі на ячэйкі складаліся такія, якія ні могуць адлюстроўваць сапраўднае становішча тэй, ці іншай ячэйкі. Інструкцыі аб парадку правядзеньня чысткі абмеркаваны былі не ва ўсіх ячэйках.

Пры здавальняючым асьвятленьні пытаньняў чысткі ў акруговай газэце «Магілеўскі Селянін» трэба адзначыць зусім слабае асьвятленьне чысткі ў насьценных газэтах.

У пэрыяд з 19-га па 23-га чэрвеня праводзілася праверка кіруючага складу Магілеўскай арганізацыі. Яна прайшла пры актыўным удзеле партыйцаў і беспартыйных працоўных мас. Вопыт гэтай праверкі быў потым шырока выкарыстаны праверачнымі камісіямі ў рабоце па чыстцы вайсковых і вясковых ячэек.

Праверка складу праверкомаў была праведзена на 5-ці куставых адкрытых партсходах, у якіх прымала ўдзел да 4.000 чалавек. Гэтыя сходы прайшлі ня з меншай актыўнасьцю за сходы, на якіх правяраліся кіруючыя кадры. Па сканчэньні праверкі кандыдатаў у праверкомы было арганізавана 15 камісій, быў намечаны календарны плян праверкі і чысткі вайсковых і вясковых ячэек. Непасрэдная работа па чыстцы ячэек фактычна пачалася з 1-га ліпеня. Да гэтага часу АКК правяла інструкцыйную нараду з праверкамісіямі, на якой дала апошнім рад указаньняў.

ЧЫСТКА ЎДАРЫЛА ПА НЕДАХОПАХ

Праверка парткалектываў вайсковых часьцей выявіла наступныя моманты: з адказаў на запытаньні праверкомаў раду партыйцаў выяўлена слабая палітычная падрыхтоўка некаторай часткі партыйцаў вайсковых арганізацый. Сярод некаторай часткі камуністых з вайсковых ячэек няма прыкладнага разуменьня кіруючай ролі рабочай клясы. Яны дрэнна ўяўляюць сабе сутнасьць і небясьпеку правага ўхілу. Так, адзін адказны вайсковы працаўнік адказаў, што «правы ўхіл—гэта буржуй і кулак». Выявіліся моманты, калі асобныя партыйцы мелі сувязь з чужым элемэнтам ў форме сумеснага правядзеньня рэлігійных сьвят, гульні ў карты, п'яństва і г. д.

Выкрыты факты недысцыплінаванасьці паасобных партыйцаў, як самавольныя адлучкі з часьці, непадпарадкаваньне загадам і інш. У вайсковых ячэйках КП(б)Б слаба яшчэ разгорнута самакрытыка: ёсьць моманты запалохваньня, баязьні выказвацца. Адначаны факты невыстарчальнай актыўнасьці беспартыйных чырвонаармейцаў пры праверцы асобных камуністых, а ў асобных мясцох асобных камуністых, а ў асобных мясцох беспартыйныя чырвонаармейцы слаба наведвалі праверачныя сходы.

Процант выключаных у вайсковых ячэйках невялікі. У парткалектыве аднаго палку з праверваных 137 чалавек выключана з партыі толькі двое. У другім парткалектыве палку з праверваных 50 партыйцаў выключана толькі 3 чалавекі.

Праверачныя камісіі па сканчэньні сваёй работы ў тэй, ці іншай ячэйцы давалі ёй рад указаньняў аб палепшаньні ўсёй работы.

У ПОЎНАЙ АДПАВЕДНАСЬЦІ З ДЫРЭКТЫВАМІ ПАРТЫІ

Праверка вясковых ячэек у Чачэвіцкім і Прапойскім раёнах, азнаямленьне з ходам чысткі і праверкі ў Шклаўской партарганізацыі паказвае наступнае:

Кіраўніцтва райкомаў справай разгортваньня самакрытыкі далёка невыстарчальнае. У некаторых мясцох амаль што зусім не праводзілася работа па калектывізацыі. Так, у адным з гэтых раёнаў толькі адзін камуністы ўваходзіць у калгас. Зусім слаба была пастаўлена работа ў гэтых раёнах па вярбоўцы ў партыю лепшай часткі батрацтва і беднаты. Характэрны і паказальны факт бяздзейнасьці ў гэтай галіне некаторых райкомаў. На вучоце ў райкомах ёсьць вялікая колькасьць батракоў і бядняцкага актыву. Але на працягу году ніводзін батрак і бядняк ня быў прыняты ў партыю. А зараз, калі праверкамісіі праводзілі чыстку ячэек, батракі пачалі ўступаць у партыю. У Чачэвічах 8 батракоў і беднякоў падалі ў праверачную камісію заявы аб уступленьні ў рады КП(б)Б. І тут-жа на сходах яны былі зацьверджаны кандыдатамі партыі. Праверка паказала, што палітычны ўзровень вясковых камуністых надзвычайна нізкі. У вясковых ячэйках пастановы XII-га зьезду КП(б)Б і 16-й Усесаюзнай Парткангрэнцыі ня былі прапрацаваны. У некаторых ячэйках камісіі сустрэліся з момантамі «кругавой парукі» сярод партыйцаў.

Праверачныя сходы да гэтага часу праходзілі актыўна, пры вялікім удзеле на іх беспартыйных сялян-беднякоў і сераднякоў. Але за апошні час у зьвязку з работаю на полі наведваньне памяншаецца. Пры праверцы ячэек беднята выяўляе вялікую актыўнасьць. Былі выпадкі, калі аб таварышы, які правяраўся, выказвалася да 20 чалавек беспартыйных сялян. Клясавы вораг--кулакі імкнуліся на некаторых сходах скарыстаць чытку для дыскрэдытацыі вытрыманых камуністых. Але яны атрымалі рашучы адпор.

Па Чачэвіцкім раёне было праверана 55 камуністых. Выключана з партыі 6 чалавек і на 15 чалавек накладзены партспагнаньні. Па Прапойскім—з 73 праверваных выключана 8 і вынесены партспагнаньні 8-мі таварышом.

Праверачныя камісіі ўвогуле ў сваёй рабоце ўзялі правільны напрамак, іх работа праходзіць у поўнай адпаведнасьці з указаньнямі інструкцыі ЦКК УсеКП(б).

ПА АРШАНСКАЙ АКРУГОВАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

Тав. Сьвірыдаў у сваім дакладзе аб ходзе чысткі і праверкі па Аршанскай арганізацыі сказаў, што падрыхтоўка была праведзена па арганізацыях здавальняюча. Зараз-жа па сканчэньні праверкі кіруючых кадраў былі праверваны таварышы, што вылучаны ў праверкомы. З таварышоў, якія былі прысланы для праверкі арганізацыі Аршаншчыны з другіх акруговых партарганізацый і таварышоў, вылучаных на месцы, было складзена 11 праверачных камісій. З імі былі праведзены дзьве інструкцыйныя нарады.

На сёньнешні дзень праведзена праверка вайсковых партарганізацый і некаторых раённых арганізацый. Па ацэнцы прадстаўнікоў вайсковых парторганаў з Смаленску праверка і чыстка вайсковых ячэек у Аршаншчыне праведзена здавальняюча.

Падрыхтоўчы матар'ял да чысткі вясковых ячэек ва многіх выпадках не высьвятляе сапраўднага становішча ячэек. Самы працэс чысткі партячэек вёскі праходзіць пры вялікай зацікаўленасьці і ўдзеле беспартыйных сялян-беднякоў і сераднякоў. Аднак, ёсьць пагроза значнага паспабленьня ўдзелу беспартыйных сялян на праверачных сходах у зьвязку з працаю на полі.

Папярэднія вынікі чысткі ў паасобных раённых партарганізацыях паказваюць, што процант выключаных даходзіць ад 12 да 18-ці.

Побач з чысткай вядзецца работа і па вярбоўцы ў партыю с.-г. рабочых і батракоў. Гэта работа ўжо дае свае станоўчыя вынікі.

Чыстку вясковых ячэек мяркуецца скончыць да 15-го жніўня.

Праверка ячэек дае багаты матар'ял і вельмі поўна характарызуе становішча парт'ячэек, ступень выкананьня асноўных дырэктыў партыі і г. д. Наша задача зараз заключаецца ў тым, каб увесь гэты матар'ял як мага паўней выкарыстаць для рашучага палепшаньня ўсёй партыйнай работы на вёсцы па выкананьні генэральнай лініі партыі.

***

На падставе дакладаў і абмену думкамі парткалегія распрацавала рад практычных прапаноў наконт узмацненьня работы па чыстцы партыі і выпраўленьні асобных недахопаў, выяўленых у рабоце праверачных камісій.

М. З—кі.

Выкарыстайце ўздым для палепшаньня ўсіх галін партработы

Вынікі праверкі Чэрвеньскай райпартарганізацыі

Камісія на працягу трох тыдняў праводзіла чыстку ячэек КП(б)Б раёну. Гэта работа дала вельмі багатыя матар'ялы ня толькі аб рабоце партыйных ячэек, але і аб стане ўсёй савецкай, каапэрацыйнай, гаспадарчай і інш. работы на вёсцы. Таму, гаворачы аб чыстцы, нельга ня спыніцца на радзе фактаў з савецкай і інш. работы.

СТАНЬЦЕ БЛІЖЭЙ ДА СЯЛЯНСКІХ БЯДНЯЦКІХ МАС

Галоўны недахоп у рабоце вясковых партыйцаў тэй, што яны слаба зьвязаны з масамі сялянскай беднаты, што яны ня чула адносіцца да запатрабаваньняў гэтых мас. Ёсьць нават выпадкі, калі паасобныя партыйцы і камсамольцы глядзяць на сялянскую масу зьнысака, ня лічацца з запатрабаваньнямі мас.

Камуністыя ў вёсцы мала аддаюць увагі барацьбе з бюракратызмам і цяганінай. Камісія сустрэлася з фактам, калі міліцыянэр выклікаў амаль усю беднату вёскі Старыя-Рэчкі на допыт. Выкліканыя прышлі за 5 вёрст, а міліцыянэр выехаў у гэты час і толькі ўвечары, пасьля таго, як сяляне чакалі яго ў сельсавеце цэлы дзень, зьвярнуўся.

Сялянкі, каб купіць хустку, хадзілі ў сельска-гаспадарчае крэдытнае таварыства (в. Грабенка) 3 дні, і ўсе тры разы загадчык крамы ня мог прадаць сялянкам хусткі. У Раванічах і іншых мясцох невядома калі адчыняюцца і зачыняюцца каапэратыўныя крамы, там заўсёды чакаюць людзі. Былі выпадкі, калі суд выклікаў па розных справах у горад да 40 сялян адразу, часамі за 20 вёрст, па некалькі разоў, пры чым выклікаліся на 9 гадзін раніцы, а судзьдзя сам прыходзіў на работу чуць ня ў 2 гадз. Можна паказаць на рад такіх сялян, якія па некалькі год дабіваюцца вырашэньня сваіх спраў, ходзяць па розных установах, часта даходзяць да Менску і назад да т. Калініна, паміж тым як усе гэтыя справы пры ўважлівых адносінах можна вырашыць і ўладзіць у паўгадзіны тут-жа на месцы. Можна паказаць на сялян, якія на хадьбу на ўстановах траціць каля 100 дзён у год.

Як толькі камісія прыяжджала ў якую-небудзь вёску, адразу сходзіліся сяляне з заявамі і скаргамі па розных пытаньнях сялянскага жыцьця. Гэта вынік таго, што працаўнікі раёну і вёскі невыстарчальна чула адносіцца да запатрабаваньняў мас ня дакладна адказваюць на ўсе запытаньні.

КАЛІ-Ж БУДУЦЬ АБРЭЗАНЫ КУЛАЦКІЯ ГАСПАДАРКІ?

У раёне шмат вялікіх вёсак, у якіх да гэтага часу яшчэ не праведзена абрэзка кулацкіх гаспадарак і зямляўпарадкаваньне. У Лядзенскім сельсавеце, ў вёсцы Старыя-Рэчкі, і інш. большасьць сялян мае па 1½ дзесяціны зямлі на 5-6 душ сям'і, у той час, як тут-жа вакол іх знаходзяцца кулацкія гаспадаркі, якія маюць па 40 і болей дзесяцін зямлі.

Не гледзячы на тое, што райком партыі некалькі разоў ставіў пытаньні аб неабходнасьці хутчэйшай абрэзкі кулацкіх гаспадарак і правядзеньня зямляўпарадкаваньня, земчастка РВК асабліва АКРЗА злачынна, нядбайна адносіцца да пастаноў раённага камітэту партыі, а заявы сялян кладуць пад сукно. У некаторых мясцох беднята пад уплывам вострай зямельнай патрэбы, прымушае сакратароў парт'ячэек і сельсаветы самачынна займацца абрэзкай кулацкіх гаспадарак. Усё гэта затягвае работу па калектывізацыі і арганізацыі новых калгасаў і ўвядзеньне іншых форм грамадзкае апрацоўкі зямлі.

УВАГА САЎГАСАМ

У раёне 4 саўгасы. Толькі адзін з іх, Раванічы, зьяўляецца паказальным для сялянскіх гаспадарак. Усе-ж астатнія, дзякуючы бюракратычнаму кіраўніцтву, з боку Белсельтэрсту, зьяўляюцца ў большасьці культурна-адсталымі, нярэнтабельнымі гаспадаркамі, напамінаючымі сабою абшарніцкія сялібы мінулага стагодзьдзя. Белсельтэрст да гэтага часу ня змог яшчэ падабраць добра падрыхтаваных кадраў загадчыкаў і іх памоцнікаў для саўгасаў, якія-б змаглі падняць гаспадарку і паставіць саўгасы на належную вышыню.

Праўда, тут можна абвінаваціць і партыйную арганізацыю, якая невыстарчальна рашуча працавала над тым, каб абярнуць саўгасы ў сапраўдныя ячэйкі сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі.

Крытыка і самакрытыка ў раёне да чысткі партыі была разгорнута вельмі слаба. І радавыя партыйцы і партактыў не адважыліся адкрыта выступаць супроць тых камуністых, якія разлагалі апарат, а ў некаторых выпадках і парт'ячэйкі. Зразумела, што і беспартыйнае працоўнае насельніцтва раёну брала ў гэтым прыклад з камуністых. Падамо некалькі фактаў.

Ніканчык заможны селянін, невядома якім чынам у 1921 году прапез у кандыдаты партыі. Ён у свой час укрываў бандытаў, абараняў кулакоў, скажаў клясавую лінію, растрацію грамадзкія грошы і пасьля ўсіх гэтых учынкаў быў райкомам замест выключэньня з партыі пераведзены на іншую больш адказную працу—на пасаду старшыні спажывецкага таварыства.

Астапонак, серадняк, таксама не зразумела, чаму з 1921 году кандыдат партыі; быў старшынёю Клінцокага і Раваніцкага сельсаветаў, растрацію дзяржаўныя грошы, абараняў кулакоў, за гарэлку абіцаў кулакам сядзібы і г. д. Замест выключэньня яго з партыі і перадачы справы ў суд, ён быў ранкомам «высунуты» за сакратара раённай зямельнай часткі. Гэта дало яму магчымасьць і надалей кампрамэтаваць партыю і савецкую ўладу. Альбо вось Мацкевіч, сын папа, член партыі з 1928 году. Для таго, каб ахарактарызаваць гэтага «камуністага», досыць падаць яго пару адказаў на пытаньні камісіі па чыстцы.

— Дзе служылі ў старой арміі?

Мацкевіч выпрастаўся і адказаў:

— Служыў у палку лейб-гвардыі яго вялікасьці.—

— Што рабілі ў часе Кастрычнікавай рэвалюцыі?

Такім-жа тонам адказвае:

— Лічыўся членам камітэту па надзяленьні «георгіеўскіх кавалераў»!

Вось гэты «камуністы» працаваў загадчыкам мэдпункту Калодзецкага сельсавету і «вучыўся» страляць з нагана ў мэдычных прылады ў тым-жа мэдпункце. Па прыкладу свайго бацькі ён браў ад сялян «падарункі» за мэддапамогу. Замест таго, каб наладзіць над ім паказальны суд, райком партыі пераводзіць яго на работу ў другі сельсавет, хаця фабрычная ячэйка, у якой Мацкевіч лічыўся членам, выключыла яго з радоў партыі.

З гэтых прыкладаў відаць як злачынцы, кулакі, прабраўшыся ў партыю, дзякуючы адсутнасьці крытыкі і пры такім «рэагаваньні» райкому на іх злачынствы маглі свабодна тварыць сваё брудныя справы, падрываючы аўтарытэт партыі.

ЯК ПРАХОДЗІЛА ЧЫСТКА

Чыстка праходзіла пры актыўным удзеле працоўных мас гораду і вёскі. На праверачных сходах сяляне, асабліва беднята, прышэўны за 10 і болей вёрст, актыўна прымалі ўдзел у абгаварэньні кожнага камуністага.

Чыстка зьявілася ня толькі праверкай работы кожнага камуністага, а і сродкам папулярызацыі і растлумачэньня мэт і задач партыі, яе апошніх пастаноў асабліва па рабоце ў вёсцы. У пачатку чысткі камісіі прыходзілася, праўда, з цяжкасьцю абуджаць масы для актыўнага ўдзелу, але потым работчыя і сяляне самі прыходзілі ў камісію з заявамі, выкрывалі нягодных камуністых, кулакоў і падкулачнікаў, што імкнуліся падарваць аўтарытэт партыі. Кулацтва старалася арганізавана выступаць супроць тых камуністых, якія праводзілі правільную клясавую лінію. Прыклад такога арганізаванага кулацкага выступленьня мы мелі ў Вайнілаўскім сельсавеце, дзе кулацтво скарыстоўвала нават беднату для дыскрэдытацыі вытрыманых камуністых. Але кулакам не ўдалося ўвесьці ў зман камісію у адносінах члена партыі Сяргея Калтовіча. На апошняга паводле няпраўдзівых допісаў было складзена 16 сьледчых спраў. Ні на воднага партыйца не паступіла так многа пісьмовых і вусных заяў у камісію, як на Калтовіча. І трэба сказаць, што да чысткі Рудня-

Агляд і чыстка апарату

У ПАЛОНЕ ПАПЕР І АБЕЖНІКАУ

Вынікі чысткі Акрстатбюро і Біржы Працы

Антысавецкія асобы на савецкай рабоце.--Сямейственасьць і кругавая парука ў Акрстатбюро.--Апарат, які не спраўляецца з даручанай яму работай.--Гняздо „былых" на біржы працы

Скончана чыстка апаратаў Менакрстатбюро і Біржы Працы. Чыстка пераварылася ў масавы агляд усёй работы ўстаноў.

Пры дапамозе брыгадзіраў, камісій садзейнічаньня, служачых і беспрацоўных камісіі выявілі рад фактаў скрыўленьня клясавай лініі, бюракратызму і цяганіны ў рабоце Статбюро і біржы.

„Армія", якую трэба праверыць

У Акрстатбюро ёсьць свая «армія». Армія ў 400 добраахвотных карэспандэнтаў. Карэспандэнты забясьпечваюць с.-г. сэкцыю весткамі аб стане пасеваў, вядуць бюджэтныя і кан'юнктурныя запісы, інфармуюць бюро аб агульным становішчы гаспадарак. На падставе карэспандэнцкіх вестак вядзецца вучот важнейшых працэсаў і зьмен у сельскай гаспадарцы, вывучаецца сялянскі бюджэт і г. д. Кожны месяц на розныя выдаткі карэспандэнты атрымліваюць у агульнай суме некалькі тысяч рублёў. Як выконваюць карэспандэнты сваю работу, і які сацыяльны склад гэтай карэспандэнцкай армії. Гэта пытаньне перш-на-перш зацікавіла камісію.

Цёмныя асобы, — былыя ўраднікі і жандары, лішэнцы, кулакі — на правах «добраахвотных» карэспандэнтаў — супрацоўнічаюць у савецкай установе. Антысавецкія асобы на савецкай рабоце. Якая іронія! Кулакі ў якасьці добраахвотных карэспандэнтаў забясьпечваюць статбюро статыстычнымі весткамі. 17 добраахвотных карэспандэнтаў вядуць спэцыяльныя бюджэтныя запісы. Сярод гэтых карэспандэнтаў ёсьць служка рэлігійнага культу. Сумны факт. Важнейшая работа, на падставе якой вывучаецца бюджэт селяніна, даручана дыякану. Да рэчы, з 17 карэспандэнтаў з нічога ня робяць. Большасьць карэспандэнтаў с.-г. сэкцыі — кулакі і моцныя середнякі. Сярод карэспандэнтаў, якія вядуць прыбыткова кан'юнктурныя запісы, вы мала сустрэнеце беднякоў і незаможных середнякоў. Кіраўнікі статбюро забылі аб клясавых задачах новай савецкай статыстыкі. Забылі і карысталіся дапамогай клясава-варожых асоб.

За „кітайскай сьцяной"

Мірна і спакойна працавалі супрацоўнікі Статбюро. Скрыпелі пер'і. Паўцелі папкі пратаколаў. За «кітайскай» сьцяной ведамсьцьвенага спакою расквітнелі агідныя традыцыі кругавой парукі і сямейственасьці. Кансэрватыўная частка апарату сустрэла камісію, як рэвізораў. Ня дзіва, што на праверачных сходах панавала сямейственасьць. Чыноўнікі з статбюро шчыра хвалілі адзін другога, упэўнівалі камісію, што «У нас усё добра! У нас чысьціць няма каго»... А на практыцы некалькі сот «добраахвотных» карэспандэнтаў складаюцца з заможных і кулацкіх элементаў. Што гэта клясавая сьлепата ці злачынны ведамсьцьвены спакой?

Апарат статбюро засьмечаны выхадцамі з варожае нам клясы, гандлярамі, домаўласьнікамі і г. д. Камісія прыняла рад пастаноў, якія разбурылі чыноўніцкі спакой і папуціну сямейственасьці ў Акрстатбюро.

Юхневіч, кіраўнік сэкцыі сельскагаспадарчай статыстыкі, з работы зьняты. Ён зусім не кіраваў работай сэкцыі. Не сачыў за правядзеньнем клясавай лініі ў рабоце сэкцыі. Гэта пад кіраўніцтвам Юхневіча с.-г. сэкцыя завербавала сабе карэспандэнтаў з ліку кулацтва, былых вураднікаў і гандляроў. Падлічэце, колькі тысяч дзяржаўных сродкаў уплыло ў рукі «кулацкіх» карэспандэнтаў.

Мацюш, кіраўнік сэкцыі сацыяльнае статыстыкі і намесьнік кіраўніка Статбюро за імкненьне замазаць палітычнае значэньне чысткі, за ўтойваньне недахопаў у рабоце апарату атрымаў «на від». Сумны фінал. Па нашай думцы чыноўнікам, якія адраджаюць традыцыі кругавой парукі, кругавай сямейственасьці у савецкім апараце — ня месца. Да рэчы: гэты самы **Мацюш** выжыў з сэкцыі ўсіх маладых працаўнікоў.

Кульган, старэйшы статыстык за грубасьць і бюракратычныя адносіны да ніжэйшых працаўнікоў атрымала вымову. Кульган дачка жандара. Палітычна — зусім напісьменная. У грамадзкай рабоце ўдзелу ня прымае.

Статыстык **Зішнеўскі** за растрату грамадзкіх грошай з работы зьняты.

Блытаніна на біржы працы.

Чыстка апарату біржы працы праходзіла пры актыўным удзеле беспрацоўных. Беспрацоўныя шчыра дапамаглі камісіі выявіць усе недахопы ў рабоце апарату. **Апарат біржы з даручанай яму работай не спраўляецца** — такі асноўны вывад можна зрабіць з вынікаў чысткі. Бязгалоздзіца і блытаніна пануе ў сэкцыі чорнарабочых. Беспрацоўныя няправільна накіроўваюцца на работу. Ёсьць беспрацоўныя, якія па некалькі год знаходзяцца на вучоце, але на работу не накіроўваюцца. Беспрацоўная **Занеўская** —на вучоце два гады. За гэты тэрмін Занеўская ніводнага разу ня была паслана на работу. І такіх фактаў шмат. Прычына ляжыць у тым, што дзеловодства ў сэкцыі вядзецца хаатычна. Тэхнічная работа ў сэкцыі заняпала. Каталёгі і сьпісы беспрацоўных складзены няправільна. Дзеловод **Маркевіч** фармальна выконвае свае абавязкі. З работай не спраўляецца. Загадчык сэкцыі **Грунецкі** груба адносіцца да беспрацоўных, нядбайна кіруе работай сэкцыі. У сэкцыі — некалькі тысяч беспрацоўных. Зрабеце вывад, як абслугоўваюцца гэтыя тысячы. Дэбашыры і хуліганы ўдала скарысталі бязьдзейнасьць апарату сэкцыі. У памяшканьні, дзе зьмяшчаецца сэкцыя, пануюць хуліганства, бойкі, лаянка. Кучка цёмных асоб тэрарызавала ўсіх беспрацоўных.

Каля вакна, дзе выдаюцца розныя даведкі і праводзіцца пасылка на работу, заўсёды стаіць у чарзе сотні людзей. Пасылка на работу праз позвы ажыцьцяўляецца толькі ў марах кіраўнікоў сэкцыі. Ніякай арганізаванасьці. Нічога падобнага на ўстанову.

Тэхнічная работа ў **юнсэкцыі запушчана**. Справы вядуцца бяссыстэмна, бясплянава, бюракратычна. Загадчык сэкцыі **Каплан** з работай не спраўляецца. Сотні беспрацоўных дарэмна чакаюць ад Каплана яснага адказу на свае пытаньні. Ніколі Каплан не адкажа беспрацоўным на хвалюючыя іх пытаньні, ніколі беспрацоўныя не атрымаюць поўнага растлумачэньня.

Сакратар біржы працы тав. **Сабяшчук** ня можа наладзіць работы канцылярыі. Работа ў канцылярыі культае. Проста кажучы ў справах канцылярыі **—хаос і блытаніна.**

Камісія сустрэлася з такімі фактамі, калі тав. Сабяшчук **фармальна і нетактычна адносіўся да беспрацоўных.** На пытаньні даваў грубыя адказы. Работу сакратара выконваць ня можа.

У апараце біржы ёсьць уласныя бюракраты. Праўда, іх ня шмат, але яны ёсьць. У гэтым напрамку першае месца належыць, бязумоўна, **Спэктару**. Спэктар—сакратар пасрэдбюро працаўнікоў мастацтва. Ён можа пратрымаць беспрацоўнага каля свайго стала цэлы дзень і ня даць ніякага адказу. Дарэмна беспрацоўны будзе зварачвацца да Спэктара з якім-небудзь пытаньнем. Спэктар адказвае на пытаньні толькі тады, калі захоча. Быў такі факт: адзін беспрацоўны электра-механік зьвярнуўся да Спэктара з нейкай важнай справай. Спэктар у гэты час быў вольны... але беспрацоўны прастаяў каля стала, за якім працуе Спэктар, цэлы дзень. І ўсёроўна не дачакаўся адказу. Нарэшце трэба сказаць некалькі слоў аб біржавым культпрацаўніку. Тав. Дан, што стаіць на чале культработы, як культпрацаўнік нікуды нваарты. Культурнамасавая выхаваўчая работа сярод беспрацоўных не праводзіцца.

Вынікі чысткі

Вывады камісіі былі простымі і рашучымі. **Грунецкага—за нядбайнае кіраўніцтва работай сэкцыі і грубыя адносіны да беспрацоўных з работы зьняць.**

Спэктару за бюракратычныя адносіны да беспрацоўных абвясьціць вымову.

Маркевіча — за дрэнную работу ў сэкцыі, ў выніку чаго тэхнічная работа ў сэкцыі заняпала, з пасады дзелавода зьняць. Камісія адзначыла, што **сакратар біржы, культпрацаўнік і загадчык юнсэкцыі** з работай не спраўляюцца. Камісія паставіла пытаньне перад адміністрацыяй аб немагчымасьці пакінуць гэтых працаўнікоў на іх пасадах.

Гандляры ў ролі „беспрацоўных"

65 беспрацоўных разумовай сэкцыі прайшлі праверку. З іх **14 вычышчана.** Былыя гандляры, кантрабандыстыя, крымінальныя злачынцы ўвайшлі ў гэты лік. 14 былых людзей з вучоту біржы працы зьняты. Зьняты па першай катэгорыі.

Макась увесь час лічыўся беспрацоўным архіварыусам. На сходзе беспрацоўных камісія высьвятліла, што гэты архіварыус у мінулым быў жандарам: служыў у польскай жандармэрыі. **Макась і Розін — вычышчаны.**

Эйдэльман — яшчэ зусім нядаўна кіраваў справамі ў камісійным магазыне. Кіраваў пакуль не папаў пад суд. Удзельнік славутай справы праўленьня працкалектыву **«Белпасрэднік»**, дзе кудзяжы, растраты і хабарніцтва ўвайшлі ў сыстэму. Зараз Эйдэльман абвінавачваецца ў розных крымінальных злачынствах. Справа яго знаходзіцца ў сьледчых органах. Камісія вычысьціла Эйдэльмана са складу беспрацоўных па першай катэгорыі. На практыцы гэта значыць — раз і на заўсёды.

Шапіра — афіцыйна лічылася на вучоце, як «прыказчыца». А ў сапраўднасьці была кантрабандысткай. Пазбаўлена выбарчых правоў. За гандаль кантрабандныемі тавамі была саслана ў Салаўкі.

«Настаўнік» — **Пігулеўскі** на справе аказаўся кіраўніком царкоўнага хору. «Прыказчык» **Даеўскі** — уласьнікам буйных рэстаранаў. Такі прыблізна твар астатніх беспрацоўных, зьнятых з вучоту.

Сьмялей высоўваць новыя кадры

З вынікаў чысткі Статбюро і Біржы Працы мы можам зрабіць некалькі вываданў. Частка кіруючых і тэхнічных працаўнікоў біржы працы не адпавядае свайму прызначэньню. У апараце Статбюро яшчэ жывуць традыцыі чыноўніцтва, фармалізму, кругавой парукі. Трэба сьмялей высоўваць новыя кадры ў нашы ўстановы.

Вынікі чысткі статбюро і біржы працы ўпарта гаворацъ за гэта.

Ю. Т—к.

ВІЦЕБШЧЫНА РЫХТУЕЦЦА ДА РЭАРГАНІЗАЦЫІ АПАРАТУ

Прыезд урадавай камісіі.—Даклад аб рэарганізацыі на прэзыдыуме АВК

(Ад нашага віцебскага карэспандэнта)

Пастанова ўраду аб вопытнай рэарганізацыі апарату Віцебскай акругі ўзварушыла ўсе ўстановы Віцебшчыны. Савецкія працаўнікі раёну на розным сустракаюць гэта мерапрыемства. І не дарма на пасяджэньні прэзыдыуму Акрвыканкому тав. **Харытонаў**,—член ЦКК УсеКП(б) прапанаваў змагацца з настроямі некаторых працаўнікоў, якія лічаць, што рэарганізацыя толькі зьнішчыць акруговы апарат.

— Нічога, акрамя шкоды, такія думкі і настроі прынесьці ня могуць, —кажа т. Харытонаў.

Некаторых з працаўнікоў хвалюе тое, што нібы прыдзецца праводзіць скарачэньне апарату, што ўмовы работы ў раёне, куды зараз пасунецца значная колькасьць акруговых работнікаў, не такія добрыя.

Але **большасьць працаўнікоў усьвядоміла значэньне рэарганізацыі і энэргічна бярэцца за працу.**

Пытаньне аб рэарганізацыі шырока абгаварвалася на пасяджэньні Акрвыканкому, яно надзвычайна зацікавіла ўсіх прысутных.

Тав. **Ракаў**, член урадавай камісіі, адзначыў у сваёй інфармацыі, што Віцебская акруга зараз становіцца ў цэнтры ўвагі ўсёй грамадзкасьці. Значэньне рэарганізацыі выходзіць за межы акругі і рэспублікі, рэформа мае ўсесаюзнае значэньне. Вось чаму да работы павінны быць прыцягнуты ня толькі мясцовыя работнікі АВК, РСІ і спэцыялістыя-рацыяналізатары, а **ўсё працоўнае насельніцтва, якое дасьць рад паказаньняў, як найлепш наблізіць апарат да насельніцтва.**

Цэнтр работы зараз падае на раён. Ці памяншаецца, ад гэтага значэньне акруговага апарату? Не, наадварот, работа ў акрузе павінна праходзіць таксама бесперабойна і нават яшчэ больш шпаркім тэмпам. Трэба дабівацца камандыраваньня ў акругу адказных працаўнікоў з цэнтральных органаў БССР. Уперадзе складаная і вялізарная праца, мы павінны цалкам аддацца гэтай справе.

Тав. **Харытонаў** адзначыў, што пасьля рэарганізацыі акруговы апарат будзе мець вялікае значэньне, як плянавы орган. Рэарганізацыя апарату акругі—казаў т. Харытонаў—пялёгкая справа. На шляху будзе сустракацца рад цяжкасьцяў, але пужацца іх няма чаго. Ня трэба баяцца бюджэтных затрудненьняў, якія могуць зьявіцца ў рабоце. Вышэйшыя органы будуць рэгуляваць пытаньні бюджэтнага характару і затрудненьні не затрымаюць перабудовы апарату.

У прынятай пастанове прэзыдыум АВК прапануе ўсім кіраўнікам акруговых савецкіх і каапэрацыйных устаноў усямерна дапамагаць ь рабоце камісіі і прыцягнуць да ўдзелу у ёй усіх адказных працаўнікоў і спэцыялістых.

Таксама адзначана, што **рэарганізацыя ні ў якой меры не павінна паслабіць тэмпу правядзеньня бягучых палітычных і гаспадарчых кампаній.**

У работу па рэарганізацыі павінны быць уцягнуты шырокія масы рабочых і працоўнага сялянства.

У склад урадавай камісіі ад Віцебшчыны ўключаны: старшыня АВК тав. **Валодзька**, член прэзыдыуму АВК т. **Аранштам** і старшыня АКК-РСІ т. **Мундау.**

Е. БУЛАШЗВІЧ.

Чыстка саматужных арцеляй своечасова патрэбна

За апошні час у рэдакцыю «Зьвязды» паступае шмат матар'ялу аб тым, што нашы саматужныя арцелі засьмечаны зусім чужымі элемэнтамі-былымі гандлярамі, спэкулянтамі, валютчыкамі і клерыкаламі, пазбаўленымі выбарчых праў. Усе яны, праўда, унесьлі ў арцелі паі па 500—700 руб., але-ж яны гэтыя арцелі скарыстоўваюць для сваіх спэкуляцыйных мэтаў.

У **Ухвальскай шавецкай арцелі** (**Крупскі раён**) некаторыя члены арцелі перакуплялі скураны тавар у найнчыкаў каапэрацыі і прадавалі арцелі па спэкуляцыйных цэнах.

У **арцелі «Пугляк»** члены арцелі падтрымлівалі самую цесную сувязь з прыватнікамі, закуплялі ў іх грамафонныя пласьцінкі без рахункаў і злоўжывалі гэтым.

Членамі інваліднай арцелі БСІКО зьяўляліся былыя буйныя фабрыканты, якія таксама падтрымлівалі сувязь з прыватнікамі.

Усе гэтыя факты пацьвердзіліся расьсьледваньнем РСІ. Праўда, у гэтых арцелях чыстка ўжо зроблена, але-ж такіх саматужных арцеляй у нас на Беларусі нямала. Трэба адначасова з чысткай савецкага апарату ўзяцца за чыстку сацыяльнага складу саматужных арцеляй і замест вычышчаных пасьпаць у арцелі бяднейшае насельніцтва.

Цудзін.

3-я ПАЗЫКА ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

Рэалізаваць 750 мільёнаў --- поўнасьцю і ў тэрмін!

Новая пазыка дасьць пачатак новым грандыёзным пабудовам, новым электрастанцыям, дасьць новыя перамогі на фронце індустрыялізацыі

Месячны заработак на трэцюю пазыку

Да ўсіх рабочых, да ўсіх працоўных

АДОЗВА МЕНСКАГА АКРУГКОМУ КП(б)Б, ЦСПСБ і АКРВЫКАНКОМУ

Рабочая кляса і працоўнае сялянства з вялізарным энтузіязмам ажыцьцяўляюць сацыялістычнае будаўніцтва, актыўна праводзячы ў жыцьцё мерапрыемствы, намечаныя 5-ці гадовым плянам разьвіцьця народнае гаспадаркі.

На часовыя затрудненьні, што сустракаюцца па шляху вялікай будоўлі, рабочая кляса і асноўная маса сялянства адказваюць падвойным напружаньнем сваіх сіл на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, умацоўваючы гэтым самым пазыцыі пралетарскае дзяржавы.

Імпэрыялістыя ўсіх краін прымаюць усе захады да таго, каб перашкодзіць нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву. Наглы напад і захоп кітайскай ваеншчынай КУЧ, недапушчэньне дэлегацыі працоўных палякаў СССР на варшаўскі зьезд — зьяўляецца вынікам правакацыйнай палітыкі сусьветнага імпэрыялізму.

Абураныя рабочыя і працоўнае сялянства СССР у адказ на наглы напад контр-рэвалюцыі патрабавалі ад ураду выпусьціць трэцюю пазыку індустрыялізацыі, каб яшчэ больш узмацніць тэмп індустрыялізацыі краіны, умацаваць абароназдольнасьць краіны і абаранаць заваёвы Кастрычніка.

Апублікаваны дэкрэт аб выпуску трэцяе пазыкі сустрэў жывейшы водгук сярод самых шырокіх пластоў працоўных мас, і гэта гарантуе, што пазыка будзе поўнасьцю і хутка рэалізавана.

Хуткая і поўная рэалізацыя трэцяе пазыкі індустрыялізацыі — парука пасьпаховага выкананьня 5-гадовага пляну. Падпіска на пазыку зьяўляецца лепшым адказам імпэрыялістым усіх колераў.

Трэцяя пазыка індустрыялізацыі — гэта 750 млн. рублёў у пазыку пралетарскай дзяржаве на індустрыялізацыю краіны.

Трэцяя пазыка індустрыялізацыі — гэта ўдар па труднасьцях, што сустракаюцца на шляху нашай вялікай будоўлі.

Трэцяя пазыка індустрыялізацыі ўмацуе абароназдольнасьць краіны.

Трэцяя пазыка індустрыялізацыі — гэта новыя фабрыкі, заводы, гіганты-электра-станцыі, саўгасы, калгасы і г. д.

Ніводнага члена прафсаюзу без аблігацый 3-е пазыкі індустрыялізацыі!

Ня менш месячнага заработку на трэцюю пазыку!

Ніводнага працоўнага селяніна без аблігацый трэцяе пазыкі!

Няхай жыве СССР — бацькаўшчына сусьветнага пралетарыяту!

МЕНСКІ АКРУГКОМ КП(б)Б.
ЦСПСБ.
АКРВЫКАНКОМ.

Узор аблігацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі

Разгарнуць спаборніцтвы на лепшую падпіску

(Гутарка з старшынёй камісіі па садзейнічаньні дзяржкрэдыту т. Хацкевічам)

Зусім нядаўна мы былі сьведкамі таго, з якім посьпехам праходзіла рэалізацыя другой пазыкі індустрыялізацыі. Дзяржава атрымала 500 міл. рублёў у працоўнага насельніцтва для разгортваньня індустрыялізацыі краіны саветаў. Працоўныя БССР, разам з працоўнымі ўсяго Саюзу, горача адгукнуліся на выпуск гэтай пазыкі і зусім у кароткі тэрмін у Савецкай Беларусі было рэалізавана 2-й пазыкі індустрыялізацыі на 10.264 т. р., што складае 194 проц. заданьня. Зараз сярод насельніцтва Саюзу разьмеркавана дзяржаўных пазык больш як на 1.100 м. рублёў. Але, зразумела, гэтых ураджай для вялізарных работ, намечаных пяцігадовым плянам разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры, не хапае. Гэта разумеюць рабочыя масы, служачыя, сялянства і байцы нашай Чырвонай армії, якія самі ўзьнялі пытаньне аб выпуску новай пазыкі індустрыялізацыі.

Працоўныя жадаюць актыўна дапамагчы ажыцьцяўленьню пяцігадовага пляну ня толькі сваёй працай, энэргіяй і вопытам, але і зьберажэньнямі.

Урад Саюзу ССР ужо выдаў дэкрэт аб выпуску 3-й пазыкі індустрыялізацыі.

Яшчэ да выданьня гэтага закону працоўныя БССР шляхам папярэдняй падпіскі сабралі сотні тысяч руб.

Каб цалкам і ў тэрмін рэалізаваць 3-ю пазыку індустрыялізацыі, трэба шырока разгарнуць спаборніцтва паміж акругамі, гарадамі, раёнамі і асобнымі вёскамі за лепшае распаўсюджваньне аблігацый пазыкі. Камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчаднай справе павінны таксама ўцягнуць працоўных сваіх калектываў у спаборніцтва на хутчэйшае правядзеньне і афармленьне падпіскі на пазыку.

Рэалізацыя новай пазыкі павінна поўнасьцю ахапіць і шырокія масы сялянства. Трэба, каб нашы нізавыя савецкія і грамадзкія арганізацыі, розныя віды вясковай каапэрацыі растлумачылі сялянам значэньне і карысьць новай пазыкі індустрыялізацыі.

Камісіі садзейнічаньня прадпрыемстваў і ўстаноў павінны разгарнуць кампанію па рэалізацыі пазыкі пад лёзунгамі—*сто процантаў месячнага заработку ў пазыку дзяржаве на ўзмацненьне індустрыялізацыі краіны, кожная сялянская гаспадарка павінна быць непасрэдным падпісчыкам на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.*

Мы зьвяртаемся з заклікам да нашага перадавога грамадзкага актыву—рабкораў, селькораў, вайскораў і юнкораў з просьбай ня толькі высьвятляць у газэтах ход кампаніі па рэалізацыі пазыкі на месцах—у горадзе і вёсцы, але і стаць самім непасрэднымі агітатарамі ў масах за пазыку.

Папярэдняя падпіска на 3-ю пазыку па БССР

Калектыў рабочых і служачых Белмясгандлю, у адказ на падзеі на Кітайска-Усходняй чыгунцы, правёў папярэднюю падпіску на 3-ю пазыку індустрыялізацыі. Лепшы прыклад паказалі: кур'ер т. Шэйдель, які падпісаўся на 90 р. (аклад пэнсіі 45 р.), і супрацоўнікі: Флейшар, Васілеўскі, Верын, Брыль, Берштэйн, якія пры акладзе пэнсіі ад 90 да 120 руб. падпісаліся кожны на 200 р.

Усяго па Белмясгандлі падпіска дала 7.200 р.

***

Рабочыя броварy «Беларусь» за некалькі дзён сабралі па падпісцы на 3-ю пазыку індустрыялізацыі каля 4.500 руб.

Падпіска працягваецца.

***

Падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на заводзе «Камунар» з кожным днём павялічваецца. На сёньняшні дзень падпіска на заводзе складае каля 18 тыс. р.

***

Настаўнікі і рабочыя Станькаўскай дзіцячай калёніі «Малады араты» падпісаліся на 953 р. звыш 100 проц. месячнай зарплаты.

***

Служачыя Барысаўскага спажывецкага таварыства падпісаліся на 100 проц. ...ай пэнсіі.

***

Супрацоўнікі Цэнтральнага Статыстычнага Кіраўніцтва ў ліку 100 чал. (з 250) падпісаліся на 3-ю пазыку на 11 тысяч руб. Аб разьмерах падпіскі можна судзіць па таму, што агульны фонд зарплаты ў ЦСУ складае 15.000 р.

***

Падпіска на будаўніцтве Асінаўскай электрастанцыі дасягнула 15 тыс. руб. Члены ІТС падпісаліся на 1 з пал. месячны аклад.

На якіх умовах рэалізуецца трэцяя пазыка

Калектывам даецца растэрміноўка выплаты на 10 месяцаў

Рабочыя і служачыя, саматужнікі, неарганізаванае гарадзкое насельніцтва і асобы вольных прафэсій, якія карыстаюцца правам голасу, маюць права набываць аблігацыі 3-й пазыкі на калектыўнай падпісцы на ільготных умовах.

Рабочыя і служачыя праводзяць сваю калектыўную падпіску праз камісіі садзейнічаньня і адміністрацыю свайго прадпрыемства, або ўстановы, а арганізаваныя саматужнікі і асобы вольных прафэсій—праз аб'яднаньні, членамі якіх яны зьяўляюцца, неарганізаванае працоўнае насельніцтва гарадоў праводзіць падпіску праз свае жыльлёвыя арганізацыі і домакіраўніцтвы.

Па калектыўнай падпісцы прадстаўляецца растэрміноўка выплаты на 10 месяцаў. Тэрмін залежыць ад пачатку ўплаты першага ўзносу.

Калі першы ўзнос зроблены ў першых чыслах верасьня (з заработнай платы за другую палову жніўня), дык за 10 месяцаў выплачваецца 21 узнос, пры чым першыя 16 узносаў выплачваюцца ў разьмерах 2 р. 50 к. за цэлую 50 руб. аблігацыю і астатнія 5 узносаў, кожны ў разьмеры 2 руб.,—за цэлую аблігацыю.

Калі першы ўзнос зроблены ў другой палове верасьня (з заработнай платы за першую палову верасьня), дык кошт аблігацыі на працягу 9½ месяцаў выплачваецца 20 узносамі, пры чым усе ўзносы складаюць 2 р. 50 к. за 15-ці рублёвую аблігацыю і г. д.

Калі першы ўзнос зроблены ў палове кастрычніка (з заработнай платы за другую палову верасьня), дык кошт набытых аблігацый выплачваецца 19 узносамі на працягу 9 месяцаў, пры чым першыя ўзносы складаюць кожны па 3 руб., а астатнія 14 узносаў—па 2 р. 50 к. за цэлую аблігацыю і г. д.

Такім чынам чым раней зроблены першы ўзнос, тым больш тэрмін выплаты, тым меншай узносы.

Пры пакупцы аблігацый па калектыўнай падпісцы пры першым узносе крэдытныя ўстановы, або ашчадныя касы, якія афармляюць падпіску калектыву, выдаюць яму разьліковую квітанцыю, на якой у далейшым робяцца адзнакі паступаючых узносаў. Пры другім узносе калектывам выдаюцца талёны, на якіх вызначаны нумары аблігацый і сэрый, замацаваных за даным калектывам. У сваю чаргу калектыў разьмяркоўвае гэтыя талёны паміж паасобнымі яго членамі.

Рэалізацыя пазыкі ў сельскіх мясцовасьцях

Продаж аблігацый трэцяе пазыкі індустрыялізацыі ў сельскіх мясцовасьцях робіцца са скідкай з 1-га верасьня па 1-га сьнежня 29 году па наступнай расцэнцы за цэлую 50-ці рублёвую аблігацыю:

з 1 па 10 верасьня 29 г.—47 р. 90 к., з 11 па 20 верасьня—48 р. 10 к., 31 па 30 верасьня—48 р. 40 к., з 1-га кастрычніка па 10-га 1929 г. 48 р. 60 к. і г. д.

За наяўны разьлік могуць прадавацца толькі сапраўдныя аблігацыі пазыкі. Продаж аблігацый за наяўны разьлік па часовых квітанцыях ў сельскіх мясцовасьцях не дазваляцца.

Продаж аблігацый з растэрміноўкай платы робіцца па 1-е сьнежня г. г. на наступных умовах: працоўнаму сялянству па цане, абазначанай на аблігацыі з растэрміноўкай да 6-ці месяцаў. Растэрміноўку ўстанаўляюць акрвыканкомы па кожнай акрузе. Узносы робіцца штомесячна роўнымі часткамі.

Работнікі міліцыі не адстаюць

Работнікі 3-га аддзяленьня міліцыі г. Менску падпісаліся на 35.000 р., што складае 120 проц. месячнай пэнсіі. З 100 чал. служачых не падпісаліся 27, якія знаходзяцца ў адпуску.

3-е аддзяленьне выклікае на спаборніцтвы ўсе аддзяленьні гарадзкой міліцыі.

Менск даў 110 тысяч рублёў

По даных галоўнай касы ашчаднасьці, папярэдняя падпіска на 3-ю пазыку па Менску дала 110 тысяч рублёў.

ШТАМП І ПОДПІС

Калісьці адзін з гэхаўскіх гэрояў па імені Фэрапонт, падносячы начальству цухлую папку з «выходзячымі» паперамі філёзофскі заўважыў:

— На тое і паперы, каб іх падпісваць.

Нябожчык філёзаф нават сам не адчуваў,ні аколькі глыбокую, не страніўшую сэнсу і па гэты дзень, ісьціну ён выказаў.

Фэрапонт служыў вартаўніком у земскай управе і свае абагульненьні рабіў на вопыце гэтай установы. Але, калі-б ён меў магчымасьць паслужыць у Менскім камгасе, дык мы ўпэўнены, што ён паўтарыў-бы сваю думку:

— Паперы, бачыш, на тое і ляжаць, каб іх падпісваў загадчык камгасу тав. **Дзічкоўскі.**

Але, канечна, мы павінны мець на ўвазе розьніцу паміж паперамі земскай управы і Менскага камгасу. А розьніца тут вялікая. Менскі камгас зацікаўлены, напрыклад, тым, каб уся пажарная ахова была ўцягнута ў сацыялістычнае спаборніцтва. (Ясна, што гэтым земскія ўправы ніколі не займаліся). Вы разумееце, канечна, што барацьба з агнём—гэта ня жарты. Той факт, што ў нас кожны год гінуць у агні сотні мільёнаў рублёў—гэта відавочна для ўсіх. Нашы пажарныя дружыны павінны ўмець ня толькі тушыць тое, што ўжо гарыць, але і папярэджваць магчымасьць «чырвонага пеўня», асабліва, на нашых фабрыках і заводах.Ясна, што ўсё гэта патрабуе ад кожнага пажарніка дысцыплініны, дакладнасьці, адважнасьці—таксама, як ад байцоў Чырвонай арміі.

— Берагчы сацыялістычнае дабро ад агню—гэта вялікая, пачэсная работа. І сацыялістычнае спаборніцтва паміж камандамі на лепшую работу ў гэтай галіне—зусім пасьпеўшая задача, якая ўваходзіць у агульны плян ўздыму сьвядомых камуністычных мэтадаў работы ўсіх працоўных.

Адным словам, я хачу сказаць, што ідэя сацыялістычнага спаборніцтва ў пажарнікаў, узьнікшая ў кіраўнікоў Менскага камгасу, зусім правільная і патрэбная. Тым больш, што недахватаў на гэтым айтышпажарным фронце, ёсьць яшчэ шмат.

Дык пры чым-жа тут фэрапонтава філёзофія,—могуць спытаць у нас.

Усё-ж такі мы гаворым, што сувязь тут ёсьць і Фэрапонтава філёзофія нам яшчэ прыгодзіцца. Ад добрай ідэі да справы, як кажуць—дыстанцыя вялікага разьмеру. Можна прыняць пастанову аб сацыялістычным спаборніцтве, потым забыць аб ім, а ўспомніўшы, напісаць цыркулярчык... глядзіш справа і рухаецца праз пень-калоду.

Здасьцца, што ў Менскім камгасе так іменна і абстаіць справа з сацыялістычным спаборніцтвам пажарнікаў. І ва ўсякім разе перад намі ляжыць паперка, якая наводзіць на падобныя думкі (меў рацыю Фэрапонт). Гэтая паперка (за № 6798) адрасавана начальніку менскай пажарнай дружыны т. Казагонку (а судзячы па праваму куту паперы і яго акруговым калегам). Паперка, як гаворыць, ня горш і ня лепш за шмат іншых, але не пазбаўлена камгасаўскай арыгінальнасьці.

— «Ня гледзячы на цэлы рад дадзеных вам указаньняў, да сучаснага моманту вы нічога не зрабілі ў частцы сацыялістычнага спаборніцтва, а пагэтаму (вось іменна, а пагэтаму...») прапаную вам пад асабістую адказнасьць прыняць усе меры (?) да ажыцьцяўленьня данага пытаньня, згодна тых указаньняў, якія вы маеце». (Папер, як вядома бяз подпісу ня бывае, і таму мы ставім пад ёю: «Загадчык камгасу Дзічкоўскі»). Значыць сацыялістычнае спаборніцтваабутку і выклікае агульнае павялічэньне ў пажарнікаў стаіць на мёртвым пункце, «ня гледзячы на цэлы рад дадзеных указаньняў»... Чамусьці ня верыцца, што гэта будзе выпраўлена новай падпісай вышэй радыкальнай «адносінай». Ды і сапраўды, як можа быць інакш, калі сацыялістычнае спаборніцтва стала толькі «даным пытаньнем».

Мы пацікавіліся тым, якія-ж ўказаньні былі даны, напрыклад, на чальнікам менскай пажарнай аховы тав. Казачэнку. Здавалася-б, што ў гэтым выпадку камгас скарыстае свае геаграфічныя выгады разьмяшчэньня. Аднак, той будзе памылыцца, хто падумае, што камгас злоўжываў сваёй блізкасьцю да менскай пажарнай каманды: ніякіх указаньняў наконт сацыялістычнага спаборніцтва начальнік каманды не атрымліваў.

Так заявілі працаўнікі парт'ячэйкі менскай пажарнай каманды. Гэта зусім магчыма, паколькі цыркуляры пішуцца нават тады, калі «падпарадкаваныя ўстановы» знаходзяцца на адлегласьці аднаго-двух кварталаў. Кажуць, што менскія пажарнікі па ўласнай ініцыятыве сваіх працаўнікоў і парт'ячэйкі ўжо шмат чаго дабіліся ў сэнсе ўздыму працдысцыпліны і зараз ня маюць ніводнага нявыхаду на дзяжурства. Але ім, як сталічнай камандзе, трэба дабіцца яшчэ большых вынікаў, каб заняць сваё месца сярод сьвядомых змагароў за ахову савецкай маемасьці.

Ці патрэбна тут дапамога і кіраўніцтва? Зразумела. А Менскі камгас пасылае цыркуляры (нават сваім менскім установам) і чакае «ажыцьцяўленьня данага пытаньня». Ці вераць у камгасе ў цудоўную моц сваіх цыркуляраў? Здаецца, што не. А для чаго падпісваюць. Вось тут нам і прыходзіцца ўспомніць фэрапонтаву глыбокую думку:

На тое і паперы, каб іх падпісвалі ў Менскім камгасе.

Дальнабачны філёзаф быў стары Фэрапонт.

Р. К.

ЗАБЯСЬПЕЧАНЬНЕ ГАРАДОЎ БССР ПРАДУКТАМІ

Наш супрацаўнік меў гутарку з намесьнікам Наркамгандлю т. Абрамсонам на тэму аб забесьпячэньні насельніцтва БССР хлебам, мясам і малочнымі прадуктамі.

— Добры ўраджай гэтага году,— заявіў т. Абрамсон,—пры захаванні мер па эканоміі выдаткаваньня хлеба, значна палепшыць становішча з хлебам. У будучым годзе будзе адчувацца толькі напружанае становішча з мясам і малочнымі прадуктамі.

— У мінулым годзе, у сувязі з неўраджаем кармоў, сялянства выкінула на рынак вялікую колькасьць быдла. Ураджай гэтага году і льготы па сельгаспадатку прывядуць да таго, што

Антысавецкае выступленьне клерыкалаў у Тураве

Былы сакратар Тураўскага РВК патураў антысавецкаму элемэнту

Ініцыятары выступленьня асуджаны Мазырскім акрсудом

Быў у м. Тураве, Мазырскай акругі, поп-благачынны Кароль Пётра. Карыстаючыся людзкою цемраю, ён за кошт сваіх «пасомых» добра жыў на гэтым сьвеце, а ім абяцаў «царства нябесное».

Поп вельмі любіў гаварыць сваім «авечкам» красамоўныя казаньні, і часта ў сваіх пропаведзях праводзіў контр-рэвалюцыйную агітацыю, за што і быў заарыштаваны органамі ДПУ.

Застаўшыся без благачыннага, другі поп Адамовіч Іван, задумаў вызваліць свайго «калегу па працы»—Караля, для чаго і навёў адпаведную падрыхтоўку.

Па ініцыятыве Адамовіча была склікана неафіцыйная нарада царкоўнага савету, дзе было пастаноўлена нацкаваць масы веруючых, асабліва жанчын на мясцовыя органы ўлады. Далей хітры баця пачаў шукаць законных спосабаў для ажыцьцяўленьня гэтай злачыннай пастановы. Ён зьвярнуўся ў Тураўскі РВК, сакратар якога, Мельчанка Пётра, выдаў папу афіцыйны **дазвол склікаць агульны сход веруючых «па пытаньні аб арышце папа Караля».** Атрымаўшы гэты дазвол, поп Адамовіч да таго абнагледзеў, што напярэдадні сходу паслаў прапанову старшыні мяст. савету Шчакатовічу зьявіцца на сход у царкву для засьведчаньня подпісаў веруючых.

Назаўтра, пасьля ютрані, Адамовіч адкрыў сход веруючых, на якім сабраліся мясцовыя мяшчане, кулакі і іх падпявалы.

Адамовіч сказаў «гарачую» прамову аб неабходнасьці вызваленьня папа Караля, а Лявіцкі склаў прыгавар, у якім гаварылася, што Кароль «человек отличного поведения и покорный исполнитель распоряжений советской власти», чаму і трэба яго вызваліць.

Бачучы, што Шчакатовіч ня прыйшоў у царкву «сьведчыць» подпіс веруючых, Адамовіч прапанаваў: «тым хто хоча падпісацца на прыгавару за Караля, просім ісьці ў савет».

У выніку апрацованы адпаведным чынам, натоўп народу у 200 чалавек на чале з псаломшчыкам Лявіцкім, рынуўся з крыкамі праз усё мястэчка да мяст. савету. Уварваўшыся ў памяшканьне савету, Лявіцкі настойліва прапанаваў Шчакатовічу «засьведчыць» прыгавар. Натоўп пачаў бунтаваць і паламаў баляскі. Адзін з буянаў, ускочыўшы на лаўку, крычаў, паказваючы на Шчакатовіча: «бі яго». Старшыня савету ледзь уніканў расправы і выклікаў міліцыю.

Да адказнасьці былі прыцягнуты разам з попам Адамовічам і псаломшчыкам Лявіцкім 10 самых актыўных буянаў. Гэтыя 10 прыгавораны Мазырскім акруговым судом да каротка-тэрміновага пазбаўленьня волі. На падставе амністыі, 7 чал. ад кары вызвалены, двум—зняволеньне ў спраўдоме заменена прымусовымі работамі, аднаму—штрафам.

Галоўныя злачынцы поп **Адамовіч** і псаломшчык **Лявіцкі** прыгавораны кожны да аднаго году пазбаўленьня волі са строгай ізаляцыяй. Па адбыцьці зьняволеньня суд пастанавіў высяліць іх за межы БССР на пяць год кожнага.

Акрамя таго, суд пастанавіў прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці па 197 арт. КК б. сакратара Тураўскага РВК Мельнічанку М. за выдачу папу Адамовічу дазволу на скліканьне незаконнага сходу веруючых.

Б.

На пабудове унівэрсытэцкага гарадка

Ці будзе ён скончан у тэрмін?

Гэтымі днямі Белдзяржбуд атрымаў ліст ад «Госсантехстроя», які вядзе на унівэрсытэцкім гарадку работы па вэнтыляцыі і ацяпленьні, аб тым, што «Госсантехстрой» прымушаны **адцягнуць сканчэньне работ на паўгода.** «Госсантехстрой» гэту патрэбу матывуе тым, што яму прыходзіцца чакаць перапрацоўкі праекты вэнтыляцыі і часткова ацяпленьня таксама (анатамічны корпус), бо Наркамасьветы і прафэсура БДУ кожны раз высоўваюць новыя патрабаваньні. Патрабаваньні гэтыя зьвязаны з вьменай калёрыфэраў (прылады ацяпленьня), матораў і вэнтылятараў. Напрыклад, на мэдыцынскім корпусе замест запраектаванага аб'ёму цадагрэтага цаветра ў 16 тысяч куб. мэтраў заяўлена патрабаваньне на аб'ём паветра ў 20 тысяч куб. мэтраў, што выклікае неабходнасьць замяніць заказаны вэнтылятар № 6 з пал. на № 8.

Заводы, якія выконваюць заказ «Госсантехстроя» на апаратуру па вэнтыляцыі ў зьвязку з гэтым адкладаюць выкананьне заказу на 5 месяцаў.

Увесь час мяняюцца перагародкі ў прыродазнаўчым і анатамічным карпусох, што зноў такі павялічвае тэрмін сканчэньня работ і зьвязана з лішнімі выдаткамі.

Усё гэта гаворыць нам аб тым, што Наркамасьветы будаўніцтва унівэрсытэцкага гарадка вядзе без прапрацаванага пляну. Ня менш ясна, што тэхнічны нагляд Наркамасьветы таксама блукае ў цемры і ходзіць на вяроўцы ў прафэсуры БДУ. Прафэсура дакладна ня ведае, што ёй трэба, або пры распрацоўцы праекту яе ня пыталі. Увогуле пры пабудове унівэрсытэцкага гарадка наглядаецца паўнейшы хаос.

Што-ж робіць архітэктар **Лаўроў**: якую работу ён вядзе ў Наркамасьветы ў ролі асобы, якая ажыцьцяўляе тэхнагляд? Ці зацікаўлены ён сканчэньнем работ у тэрмін? Ці ня трэба было ўжо даўно пакончыць з хістаньнямі, што наглядаюцца ў кіраўніцтве пабудовай унівэрсытэцкага гарадка. Калі гэтыя хістаньні будуць мець месца і надалей, то можна з упэўненасьцю сказаць, што унівэрсытэцкі гарадок у тэрмін ня будзе скончаны.

Будаўнічаму камітэту, Дзяржпляну, саюзу будаўнікоў трэба ў гэту справу ўмяшацца, каб папярэдзіць зрыў сканчэньня работ па пабудове унівэрсытэцкага гарадка.

Кульнін.

У суботу, 27-га ліпеня, у садзе «Прафінтэрн» адбудзецца мітынг-масаўка камсамольскай арганізацыі сумесна з рабочай моладзьдзю ўсіх прадпрыемстваў гораду Менску. Збор па прадпрыемствах а 5 гадзіне, у РК КСМ а 6-й гадз., пачатак мітынгу а 7 гадзіне ўвечары. Уваход па камсамольскіх і прафсаюзных білетах.

Пасьля мітынгу--масавае гуляньне.

АК ЛКСМБ.

МЕНСК

Праект дому ўраду БССР



Сьвята рабочых заводу „Камунар"

У нядзелю, 28-га ліпеня, рабочыя заводу «Камунар»—сьвяткуюць гадавіну з дня заснаваньня заводу і гадавы юбілей парткалектыву. Завод стварыўся пасьля аб'яднаньня 3-х прадпрыемстваў («Мэтал», «Усход» і с.-г. майстэрні імя Бурбіса,) і за год значна пашырыўся. Вырас і парткалектыў заводу.

Сьвята праводзіцца на станцыі Крыжоўка (некалькі вёрст ад ст. Ждановічы), куды ўвесь калектыў рабочых выяжджае на маёўку. Сумесна з рабочымі ў Крыжоўку выяжджаюць і прадстаўнікі суставарыскай часьці Чырвонай армії. Рабочыя запрасілі на сьвята сялян з падшэфных заводу вёсак.

У бюро калектыву заводу паступіў рад заяў ад рабочых аб уступленьні ў рады камуністычнай партыі. У Крыжоўцы адбудзецца адкрытае пасяджэньне бюро, на якім будуць разглядацца заявы таварышоў.

Сьвята ўвязваецца з Міжнародным Чырвоным Днём. Даклад зробіць прэзыдэнт Беларускай Акадэміі Навук т. Ігнатоўскі.

Прыём у Менскі палітэхнікум

Пры Менскім дзяржаўным палітэхнікуме ў бягучым навучальным годзе адкрываецца хэмічнае аддзяленьне, замест хэмтэхнікуму. Такім чынам, палітэхнікум будзе існаваць у складзе ніводзі аддзяленьняў: архітэктурнага, дарожнага, гідратэхнічнага, тарпяногa і хэмічнага.

Прыём заяў на ўсе аддзяленьні—да 1-га жніўня.

Іспыты для паступаючых пачнуцца з 5 жніўня, а 10 гадзіне раніцы.

Вялікая навальніца ў Менску

Папсавана тэлефонная сетка

Ноччу з 24 на 25 ліпеня ў Менску была вялікая навальніца, ад якое падарпела тэлефонная станцыя.

У горадзе зарэгістравана 80 выпадкаў папсаваньня тэлефоннай лініі.

Учора станцыя накіравала для рамонту гарадзкіх тэлефонных ліній значна больш лік рабочых, чым пры нармальнай рабоце.

Навальніца папсавала і міжгародныя тэлефонныя лініі. Учора днём, усе тэлефонныя правады на міжгароднай сетцы былі папраўленыя.

***

Ад урару маланкі загарэўся адзін з будынкаў кашарскіх казармаў. Яшчэ да таго, пакуль зьявілася пажарная каманда, пажар патушылі чырвонаармейцы.

Маскоўская рабочая дэлегацыя вітае пралетараў Менску і Мазыру

Маскоўская рабочая дэлегацыя, якая наведала ўрайскія калгасы БССР, пакінула межы Беларусі. З дарогі яна прыслала ліст, у якім шле разьвітальнае прывітаньне менскім і мазырскім рабочым. Дэлегацыя спадзяецца, што пралетары Менску і Мазыру забясьпечаць правільнае кіраўніцтва работай калгасаў.

Павышэньне кваліфікацыі падросткаў

У гэтым годзе ВСНГ адкрыў па БССР 12 прафтэхкурсаў для навучаньня падросткаў, праз курсы было прапушчана 400 чал. У наступным годзе будзе адкрыта яшчэ 8 прафтэхкурсаў.

Пабудова каналізацыйнай станцыі

У Менску на рагу Пуліхаўскай і Сьлясарнай вул. будуецца насосная каналізацыйная станцыя. Пры станцыі будзе пабудаваны таксама бэтонны рэзэрвуар для сьцёку вады. Аканчваецца пабудова падземнай галерэі для пракладкі труб.

Пабудова станцыі будзе закончана ў кастрычніку і абыйдзецца ў 140.000 р.

50 пажарных машын для сельскіх дружын

Пажарны аддзел НКУС купіў у Маскве 50 пажарных машын. Машыны куплены на сродкі, сабраныя па самаабкладаньні, і будуць разьмеркаваны паміж сельскімі пажарнымі дружынамі.

150 новых прыказчыкаў ЦРК

Гэтымі днямі адбудзецца выпуск 150 чал. прыказчыкаў, якія скончылі курсы працаўнікоў прылаўку. Курсанты набраны з біржы працы і будуць замяшчаць вычышчаных з капэрацыйных арганізацый. Скончыўшыя курсы будуць разьмеркаваны паміж крамамі і установамі ЦРК.

Барацьба з растратамі

Сэкцыя РСІ пры Менгарсавеце праводзіць абсьледваньне ўстаноў для выяўленьня становішча кас і барацьбы з растратамі. Сэкцыя абсьледвала касы 27 устаноў, прычым, выяўлены рад недахопаў. Вынікі абсьледваньня перададзены ў РСІ.

Сёньня, а 7 гадз. увечары ў памяшканьні клюбу саўгандаль-служачых адбудзецца

нарада ўсіх старшынь камісій садзейнічаньня дзяржкіраўдыту і ашчаднай справе

пры ўстановах і прадпрыемствах г. Менску.

Парадак дня: 1. Аб рэалізацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі. 2. Бягучыя справы.

Яўка ўсіх старшынь абавязкова без спазьненьня.

Менкамісія садзейнічаньня пры АВК.

Чаму загінуў рабочы Васільлеў

Трэба ўзмацніць нагляд за тэхнікай безапаснасьці

У няшчасным выпадку на галоўным корпусе пры пабудове унівэрсытэцкага гарадка нельга вінаваціць ні адміністрацыю, ні тэхпэрсанал пабудовы. Здарыўся гэты выпадак ня ў момант работы машыны, якая зьявілася прычынаю сьмерці рабочага, а пры мантажы яе (падрыхтоўка яе да работы). Цесьляру т. Васільлеву трэба было ўлезьці ў прыямак ля бэтона-мяшалкі (быў ён там, між іншым, не адзін, а з таварышом, які пасьпеў выскачыць) для выкананьня пэўнай работы. Праходзіў міма малады мацёр т. Бусловіч і заўважыў непарадак у машыне: дзьверцы машыны былі адчынены ў той час, **як яны павінны быць зачынены,** а адчынілі іх таму, што быў падняты жалезны коўш бэтаньера, які звычайна знаходзіцца ў прыямку ля машыны. І хоць Бусловіч ведаў і бачыў, што ў прыямку бэтаньера ёсьць людзі, але рухомы нейкім незразумелым унутраным імпульсам, ён **уздумаў прывесьці дзьверцы ў іх нармальнае становішча,** г. зн. зачыніць іх. А дзьверцы не зачыняліся, гэтаму перашкаджала падвалінка, якая рэгулявала рух каўша ўверх і ўніз. Ён і пацягнуў за гэтую падвалінку. Вынікам было раптоўнае палзьненьне каўша, які адразу забіў чалавека.

Душэўны стан т. Бусловіча у момант няшчасьця правільна ўстановіць дактары-псыхіятры. Інспэкцыя працы-ж не знайшла ў даным выпадку ні віны адміністрацыі, ні тэхпэрсаналу пабудовы.

Але нам гэта здарэньне павінна паслужыць папярэджаньнем ад тых няшчасных выпадкаў, якія могуць быць у выніку прычын, **ня зьвязаных з асаблівым душэўным станам таго ці іншага працаўніка пабудовы.** Сваячасова пастаўціць пытаньне аб пастаноўцы справы аховы працы на пабудовах на адпаведную вышыню. У Маскве і Ленінградзе на пабудовах устаноўлены пасады для асоб, якія спэцыяльна загадваюць тэхнікаю безапаснасьці. Такіх асоб бывае нават некалькі, у залежнасьці ад разьмераў пабудовы. У Беларусі-ж ні на адной пабудове няма спэцыяльных адказных асоб за тэхніку безапаснасьці.

Час ужо і Белдзяржбуду—самай вялікай будаўнічай арганізацыі ў БССР—завесьці на сваіх буйных пабудовах пасады падобных адказных асоб за тэхніку безапаснасьці.

Няхай гэты выпадак паслужыць вурокам.

Д. К—н.

Як можна пазбавіцца ад непажаданых кватарантаў

Цягнецца гэта гісторыя ўжо даўно, гады паўтара. Ня ўзьлюбіў за невашта сваю кватарантку, гр-ку А. Г. (члена саюзу Мэдсанпрацы, фэльчарыцу аднэй з больніц г. Менску) уласьнік дамоў па Грыгораўскай вул. № 22 гр-н **Грыцук** і пачаў ўсялякімі спосабамі яе высяляць. Перш-на-перш ён нацкоўвае на непажаданую кватарантку сваю жонку.

Цікава хоць крышку ахарактарызаваць гэту асобу. Жонка Грыцука, гр-ка Сыч, вельмі ганарыцца сваім паходжаньнем: была замужам першы раз за кіраўніком маёнтку ў памешчыка і інакш не дазваляе сябе называць, як толькі—«пані». Калі да яе зварачаюцца бяз гэтага тэрміну, яна проста не адказвае. Заядлая клерыкалка, яна за людзей лічыць толькі ксяндзоў ды іншых «былых паноў», рэшта ў яе —«хамы». Зяць яе, гр-н Віленцэй, заядлы антысэміт і хуліган, пядаўна выключаны з членаў саюзу і зьняты з працы на прадпрыемстве БДВ за антысэмітызм і хуліганства, аб чым паведамлялася ўжо ў «Зьвязьдзе».

І вось гэта «пані» пачынае цкаваньне. Нідзе не дае праходу сваёй кватарантцы, гр-цы А. Г., абазывае яе рознымі няпрыстойнымі словамі, плюе на яе пры спатканьні, называе «хамкаю», «патаскухаю» і іншымі падобнымі эпітэтамі.

Нарэшце, у канцы мая, а 11-й гадз. увечары, уварвалася ў кватэру гр-кі А. Г., калі апошняя была адна з маленькім дзіцём, моцна аблаяла яе рознымі агіднымі словамі і ў дадатак пабіла.

1-га чэрвеня гр-ка А. Г. атрымала на месцы службы водпуск і паехала ў Эўпаторыю на два месяцы для лячэньня хворага дзіцяці. Тут узяўся за высяленьне сам дамаўласьнік Грыцук. Ён да гэтае справы падыйшоў проста. Піша заяву ў пракуратуру, што гр-ка А. Г. выехала зусім з Менску. Пракуратура выдае «мудры» загад міліцыі—узламаць кватэру.

Ня гледзячы на тое, **што за кватэру заплочана да 1-га верасьня** і гр-ка А. Г. перад выездам **папераджала міліцыю,** што выяжджае на два месяцы,—**міліцыя кватэру ўзламала і перадала ключы і ўсе рэчы Грыцуку.**

Цікава, **чаму пракуратура на падставе голай заявы дамаўласьніка выдае дазвол ўзламаць замок, і як гэта самая пракуратура паглядзіць на гэтні абураючы ўчынак упраўнага дамаўласьніка.**

КВАТАРАНТ.

Да Міжнароднага Чырвонага Дня

Маршрут мопраўскага карнавалу

Камісіяй па правядзеньні мопраўскага карнавалу разам з дэманстрацыяй гурткоў Асоавіяхіму, Аўтадору, Чырвонага Крыжу і фізкультурнікаў г. Менску намечан маршрут, па якім будзе рухацца ўся гэта дэманстрацыя.

Карнавал выступае а 11 гадз. раніцы, у нядзелю, 28 ліпеня, ад вул. К. Маркса, Пралетарскай, Шырокай, вул. Мопру, Камунальнай, міма плошчы Парыжкае Камуны, зноў на Пралетарскую, Кастрычніцкую, на пляц Волі, па Інтэрнацыянальнай, Валадарскай і на вул. К. Маркса.

Ц—ы.

Новы склад акруговага суду

Прэзыдыум Акрвыканкому абраў новы склад акруговага суду ў складзе старшыні т. Тымінскага, нам. старшыні т. Кімэ, і членаў суду т. т. Грамыкі, Шыфрына, Шмых, Раўкіна і Пекура.

Навіны беларускага кіно

Культфільм „Знойдзеная зямля"

На Асінбуд выехала група кіно-работнікаў, каб зрабіць здымкі будаўніцтва станцыі для вялікага культфільму «Знойдзеная зямля».

„Адказ фашыстым"

Белдзяржкіно заключыла і ў бліжэйшыя дні выпушчае карціну «Адказ фашыстым». Карціна мэлюе быт і жыцьцё палякаў у БССР.

Рэжысэр—Альшанскі, апэратар—Кальцаты.

Паведамленьні

У суботу, 27 ліпеня 1929 г. роўна а 12 гадз. дня ў памяшканьні фрунзаўскага РК КП(б)Б адбудзецца нарада сакратароў савецкіх яч. КП(б)Б фрунзаўскага раёну. Парадак дня;

Выпікі агляду падрыхтоўкі савецкіх ячэек да чысткі партыі і далейшыя задачы.

На гэту нараду, акрамя сакратароў яч. у абавязковым парадку павінны зьявіцца наступныя таварышы. т. т. Стрэле (яч. друкарні БДВ), Вайсман, Брандабоўскі (яч. Белдзяржбуду), Круглік, Давідовіч (яч. Наркамправы), Грасўская (яч. 2 і 3 саў. б-цы), Ледвіч (яч. зав. ДА), Крывашэін (яч. п-к тэкстыльшчыкаў), Бялян (яч. Наркамзему), Эпштэйн (яч. Акрза), Літвіновіч (яч. Наркамгандлю), Маўчан (яч. завода «Беларусь»), Эйдэльман (яч. Камгасу), Мазчульскі, Спэктар, Брушкоў (яч. ЦВК), Фішман, Белкін (яч. Дзяржгандлю), Сватко (яч. ЦСК), Гурскі (яч. Наркамасьветы), Школьнікаў (яч. Лесбелу), Кобец (БДВ), Клейнэр (друкарня «Зьвязды»), Сяргеў (ВСНГ).

Дом Асьветы. Сёньня кіно «Хвоі гамоняць». Пач. а 10 гадз. увеч.

Заўтра--вечар, прысьвечаны двухтыдневіку фізкультуры, гуляньне, кіно. Уваход па саюзных кніжках.

— У пятніцу, 26 ліпеня, а 7-ай г. ув. адбудзецца нарада арг. сэкцыі Кастрычніцкага райкому МОПР. Для вылучаных таварышоў і ўсіх тых, хто прымае ўдзел у гэтай сэкцыі, яўка абавязкова.

— Камісія па чыстцы апарату Белдзяржстраху, паведамляе, што працяг чысткі апарату адбудзецца 26-VII г. г., роўна а 7 г. ув., у памяшканьні Дзяржстраху (вул. Савецкая і Камсамольская) на 3 паверсе. Уваход з Савецкай вул.

Запрашаюцца брыгадзіры, а таксама ўсе рабочыя і служачыя.

КАМІСІЯ.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР Музыкальная камэдыя і кам. опэра пад маст. кіраўн. Л. Г. МІРАЕВА.
Пятніца, 26 ліпеня „БАЯДЕРКА" у 3-х дзеях, Кальмана.
Білеты ў касе тэатру ад 12—2 і ад 5 г. ув. і ў раб. касе з 12—2 і ад 4—6 гадз. увеч.

КІНО-ТЭАТР „Культура" — Мастацкі фільм ШУКАНЬНЕ ДОЛІ ПАІ. Звыш праграмы гастроль Усходняга ансамбля, сусьветнага атракцыёну. Пачатак сэансу роўна а 7 г. 30 м. Каса—ад 6 г.
Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Савецкая, 71. — Вялікі мастацкі гістарычны фільм ПАЛАЦ І ЦЫТАДЭЛЯ. Гістарычная кіно-драма ў 10 частках. 2 сэансы: пач. 1-е а 9 г. 15 м., 2—10 г. 45 м.
КІНО Інтэрнацыянал — Мастацкі фільм з цыклю вядомае карціны „Чатыры Чорта" Трагэдыя акробата. Драма з жыцьця цырку ў 8-мі частках. Пачатак а 7 г. 30 м. Каса—ад 5 гадз. 30 м.
КІНО Пралетары — Новы мастацкі фільм НЕСПАДЗЯВАНЫ ГЭРОЙ. Пачатак а 7 г. 30 м. Каса—ад 6 г.
КІНО Спартак — Звыш праграмы гастролі артыста Ленінградз. тэатраў Б. А. Валенцінава. У праграме сатыра, юмар, частушкі і інш. На экране сусьв. фільм „МАТЬ" М. ГОРКАГА др. у 7 част. Пачатак а 7 г. 30 м. Каса адчынена ад 6 г.

БУДЫНАК ЦЫРКУ Панядзелак, 29 ліпеня
ЖЫВЫ АРТЫСТЫЧНЫ ШАХМАТНЫ ТУРНІР
ЧЫТАЙЦЕ АФІШЫ.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ЯЎРЭЙСКАГА — МЭДЫЧНА-САНІТАРНАГА Т-ВА
Ленінская, побач з 2-м Домам Саветаў, № 25, тэл. 12-66
АДКРЫТА ад 3 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Прыём па ўсіх спэцыяльнасьцях: унутраныя, хірургічныя, жаночыя, зубныя, вока, кожных, вуха, горла, носа і скуры
Фізіятрычны габінэт: кварц, электра і сьвэта-лячэньне.
Рэнтгэнаўскі габінэт робіць здымкі, прасьвечваньні і лячэньне хворых. Прыём хэміка-бактэрыял. аналізаў
Прыём хворых па лекавых кніжках таварыства.
— Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную плату —

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня

АБ АДЧЫНЕНЬНІ ПЭДФАКУ НА ДАМУ.

1. Пэдфак на даму мае сваёй мэтай даць маклівасьць павысіць кваліфікацыю да ўзроўню скончыўшых пэдфак БДУ тым настаўнікам, якія зараз працуюць у школах і ня маюць маклівасьці вучыцца на пэдфаку БДУ.
2. Пэдфак на даму засноўваецца пры пэдфаку БДУ і ўваходзіць у склад Бел. Дзярж. Унівэрсытэту.
3. Мыксымальны тэрмін навучаньня на пэдфаку на даму вызначаецца ў 6 год. Асобы, якія скончылі пэдфак на даму, маюць усе правы, якія атрымліваюць скончыўшыя пэдфак БДУ.
4. Асобы, залічаныя ў лік студэнтаў пэдфаку на даму, уносяць плату за навучаньне ў разьмеры, вызначаным праўленьнем БДУ і зацьверджаным НКА.
5. Пэдфак на даму ў 1929-30 л. засноўваецца ў складзе літаратурна-лінгвістычнага і сацыяльна-гістарычнага аддзяленьняў і пэдолёга-пэдагогічнага.
6. На пэдфак на даму маюць права быць залічанымі настаўнікі, якія маюць настаўніцкі стаж ня менш 2-х гадоў, маюць адукацыю ня ніжэй тай, якая патрабуецца для паступленьня ў ВНУ БССР. Асобы, якія скончылі пэдтэхнікум, маюць права быць залічанымі на 2-і курс. Сьпіс навучальных устаноў, якія даюць права на паступленьне бяз іспытаў на пэдфак на даму, устанаўляецца НКА.
7. Паверка працы студэнтаў пэдфаку на даму ўтвараецца шляхам арганізацыі заліковых сэсій-канфэрэнцый, прычым сэсіі павінны быць 2-асеньняя і веснавая.
8. Пасьля здачы залікаў і практычных заняткаў за ўвесь курс пэдфаку на даму праводзяцца дзяржаўныя іспыты.
9. Заявы ад паступаючых на пэдфак на даму прымаюцца ў дэканапе пэдфаку БДУ з 1 па 20 верасьня.
10. Залічэньне ў лік студэнтаў пэдфаку на даму праводзіцца з 20 па 25 верасьня.
11. Заняткі пачынаюцца з 1-га кастрычніка.
12. Дэканат пэдфаку павінен паведаміць падаўну заявы аб залічэньні ў лік студэнтаў не пазьней 5 кастрычніка.

АДКРЫТ ПРЫЁМ ПАДПІСКІ на ЖНІВЕНЬ і наступныя месяцы
НА ГАЗЭТУ
ЗЬВЯЗДА
орган ЦК і Мен. АК КП(б)Б.
УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.--90к., на 3м.--2 р. 60к., на 6 м.--5 р., на 1 г.--9 р. 75 к.
«Зьвязда» дае сваім падпісчыкам дадаткамі на льготных умовах часопісі

БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ	Рабоче-Крэсьтьянскій КОРРЕСПОНДЕНТ	ОГОНЕК
1 м.—20 к. (замест 35 к.)	1 м.—25 к. (замест 30 к.)	1 м.—25 к. (замест 40 к.)

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:
У Менску: Гал. к-рай газ. «Зьвязда», Савецкая, 63, ня упоўнаважанымі, адз. «Известия» и «Правда», Беларускім газэтным бюро і газэтаносцамі.
Па акругах: Упоўнаважанымі газэты „Зьвязда", адз. „Известия" і „Правда", кіёскамі к-ва Друку і ўсімі паштова-тэлеграфнымі канторамі.
З мэтай эканоміі газэтнай паперы, камплекты газэты „Зьвязда" будуць друкавацца за пэршыя чысла кожнага месяцу ў самай абмежаванай колькасьці.
Таму гал. кантора газ. „Зьвязда" просіць усіх падпісчыкаў здаваць падпіску да 28-га чысла. Па заказах, якія паступяць у гал. кантору несваячасова, к-ра не гарантуе высылкі газэты камплектам за першыя чысла, а толькі са дня паступленьня заказу.
Каб забясьпечыць атрыманьне першых нумароў «Зьвязды» за жнівень, просьба падпісацца загадзя, не пазьней 27—29 ліпеня.

НЕ ТРЕБУЕТСЯ ЗНАНИЯ НОТ
НОВЫЙ ОБЩИЙ САМОУЧИТЕЛЬ
ДЛЯ ГИТАРЫ
МАНДОЛИНЫ И БАЛАЛАЙКИ
с новыми песнями, романсами и прочие.
Высыл. за 2 р. 25 к.
ДЛЯ ГАРМОНИИ
(двухр.) русск. и заграничн. строя такой же
САМОУЧИТЕЛЬ с 30 муз. №№ высыл. за 2р. 25 к.
Адрес: Москва, Политехн. музей, 110-26.
Коопт. т-во „Культура и Знание".

ТАРГІ
28 ліпеня ў саўгасе «СЕРП», м. Сьмілавічы, адбудуцца ТАРГІ
на ПРАДАЖУ ЎРАДЖАЮ САДОЎ,
плошчаю 9 гэктараў.
Адміністрацыя.

ЮЖНЫЙ ТРЕСТ — ЛУЧШИЙ СОВЕТСКИЙ КАРАНДАШ — ХИМСИНДИКАТ

САЧЭЦЕ
Да заўтра !!!

ЗЬВЯЗДА
ФОТО-ЦЫНКАГРАФІЯ
ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ
НА КЛІШЭ
МАСТАЦКАЕ ВЫКАНАНЬНЕ РЫСУНКАЎ.
З ЗАКАЗАМІ ЗВАРОЧВАЦЦА У ГАЛОЎНУЮ КАНТОРУ ГАЗЭТЫ „ЗЬВЯЗДА" МЕНСК, САВЕЦКАЯ, №63, 3-ЦІ ПАВЕРХ.
ПАРТРЭТЫ, ГРАВЮРЫ, ПЛЯНЫ, СХЭМЫ, ФАКСІМІЛЭ, ЭТЫКЭТЫ, ЦЭНЬНІКІ, ВОКЛАДКІ, ВІНЬЕТКІ, РЭКЛЯМНЯЯ ПЛЯКАТЫ і іншыя МАСТАЦКІЯ РАБОТЫ.

АД МЕНСКАЙ П.-Т. КАНТОРЫ
У сувязі і тым, што на пошту здаюцца карэспандэнцыі на невялічкіх ласкутках папяросной паперы без канвэртаў, што затрымлівае апрацоўку карэспандэнцыі,
Менская п.-т. к-ра папераджае кліентуру, што такія карэспандэнцыі адсылацца па прызначэньні ня будуць.
Мінімальны разьмер карэспандэнцыі устанаўляецца ў 10×7 с/м.
Рэкамэндуецца для розных паведамленьняў карыстацца паштовымі карткамі.
Адміністрацыя п.-т. к-ры.

Гидротехникам, культуртехникам, землемерам и агрономам
В ближайшие дни ПОСТУПИТ В ПРОДАЖУ
Тарасов Г. И., инженер
Материалы к уточнению проектирования осушительных систем
СОДЕРЖАНИЕ: 1. О модуле стока. 2. О расстоянии между канавами. 3. О регулировании заболоченных рек.
ЦЕНА 1 руб. 75 коп.
ЗАКАЗЫ НАПРАВЛЯТЬ: Западная областная опытно-мелиоративная станция, г. Смоленск, Социалистическая, 4.

АДПУСКВІКІ!
НЕ ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ПЕРАД АДЫХОДАМ — У ВОДПУСК ПАВЕДАМІЦЬ У —
кантору газэты „ЗЬВЯЗДА" Савецкая, 63 тэл. 7-81
ВАШ НОВЫ АДРАС
Вам будзе пасылацца «ЗЬВЯЗДА» па месцы знаходжаньня ў водпуску
без асобнай даплаты за перамену адрасу.

ПРАДАЮЦЦА БОЧКІ з жалезнымі абручамі ад друкарскай фарбы.
Зварочвацца да заг. гаспад. друк. «Зьвязды» (Савецкая, 63) ад 3—5 гадз. дня.

Згубленыя і ўкрадзеныя дакуманты лічыць несапраўднымі

Вучотн.-конская кніжка № 2.014 Нарэйка П. Я. 639
Вуч.-конская кніжка Чорвага Б. Л., выд. Сьмілавіцк. РВК 640
Паявая кніжка № 3.085 Гатальскага П. І., выд. Чавуск. спажыв. т-вам. 641
Вайсковая кніжка № 449 Ермаленка Г. І., выдан. Тураўскім РВК. 642
Замацаваныя талёны за аблігацый 2-й пазыкі індустрыялізацыі за №№ 4514, 4519, 4529, 8341 і 52989 на імя Азарх П. 643
Дасабов. кн. № 1885, вуч.-конская кніжка № 3730, выдан. Бярэзінск. РВК на імя Сасноўца А. К. 644
Членскі білет № 49 Ярушова І. Д., выд. саюзам камунальнікаў. 645
Вуч.-конская кніжка Рабчэнка Ю., выд. Сьмілавіцкім РВК. 646
Вуч.-конская кніжка Зарахоўскага Д. Т., выд. Расонск, РВК. 647
Вуч.-конская кніжка № 10741 Гатоўка Л. С., выд. Лепельскім РВК. 648
Дзьве вучотн.-конскія кніжкі №№ 820 і 987 Камінскага Л. М., выдан. 4-м ваенна-конск. вуч. Мазырск. акр. 649
Вуч. асабовая кніжка Козелла Ф., выд. Пухавіцк. РВК. 650
Вуч.-конская кніжка № 670 Кароткага А. І., выдан. Сьмілавіцкім РВК. 651
Вуч.-конская кніжка Скуратовіча А., выдан. Смілавіцкім РВК. 652
Вайсковая кніжка Курылёнка Т. К., выд. Магілеўск. ваенкаматам. 653
Паявая кніжка Рыўкінай П. Р., выд. Чавуск. спажывецк. т-вам 654
Чл. паявая кніжка № 2091 Працкофьева С., выд. Старасяроцінск. спажывецк. т-вам. 655
Вуч.-конская кніжка Забаўчыка І. Я. 656
Прафсаюзны білет ВСРМ №30291 Мальчыкава І. П. 657
Вуч.-конская кніжка № 888 Гурыповіч М., выд. Грэскім РВК 658
Вуч.-конская кніжка № 4003 Бараула Е., выдан. Бярэзінскім РВК. 659

Кошт публікацыі 50 к. аб згубе дакумента

Друкарня газэты «Зьвязда». Менск

Менск. Галоўлітэр № 5[illegible]

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2